Пролетарии всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער פאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пралетары ўсіх краёў, злучайце с.а

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Змена адрасу: мясцовага—10 к., іншагароднага—20 кап.
Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы та 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня
Без. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх п
РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, Савецкая, 63.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок монпарэлі (
50 кап. Для М
Пасярод
Пры шматр
Згодна па
бірацца з

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральн. Камітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня: тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Канторай, Кантора абвестак і падпіскі) тэл. № 781.

ЧАЦЬВЕР, 12 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 10 (2817)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.
Год выданьня дванаццаты.

ДА ССА
эра 13, Одесской
ственн. Публичн

Каапэрацыя і пазыка ўзмацненьня сельскай гаспадаркі.

Сельскай гаспадарцы неабходна паладзіць таваразварот паміж вёскай і горадам, патаніць яго і ардані авацъ такім чынам, каб патрэбны для вёскі тавар атрымліваўся своечасова і неабходнай якасьці, а патрэбны для гораду прадукт вёскі зьбіраўся і адпраўляўся без затрыманьня. **Усялякая замінкаў рэалізацыі сельска-гаспадарчай прадукцыі расстройвае рынак і б'е ня толькі па гарадзкім насельніцтве, але і больш усяго па насельніцтве сельскім, больш распыленым.** Пара, каб кожны селянін зразумеў, у якой меры яго гаспадарка, што матар'яльны добрабыт залежаць ад правільнага і рэгулярнага разьвіцьця рынкавага звароту. Толькі сьляпыя ці безнадзейна цёмныя сельскія гаспадары могуць дазволіць слабе пераканаць, быццам добрабыт іх двара не залежыць ад становішча ўсяе народнае гаспадаркі, быццам яны могуць замкнуцца ў сваю ўласную паасобную шкарлупку.

Але правільна наладзіць таваразварот,—значыць пазбавіць селяніна ад эксплёатацыі скупшчыка-ліхвара і кулака, значыць аб'яднаць намаганьні сялян-беднякоў і сераднякоў, значыць узмацняць спажывецкую і сельска-гаспадарчую збытавую каапэрацыю і каапэрацыю па забесьпячэньні. Неабходна ў гэтыя каапэрацыйныя арганізацыі зьнізу і даверху ўліць усю маючуюся ў працоўных грамадзкую энэргію і ўсе зьберажэньні, якія могуць быць накоплены для гэтай мэты.

Сялянам-працоўным неабходна, перш за ўсё і галоўным чынам арганізаваная самадапамога. Гэтая самадапамога ідзе ад каапэрацыі ва ўсіх яе сыстэмах і разгалінаваньнях. Гэтая самадапамога ідзе і ад мясцовых саветаў, якія арганізоўваюць і аб'ядноўваюць сялян-працоўных на глебе самакіраўніцтва. Таму навінны быць пакіраваны ўсе намаганьні саміхжа сялян для фінансавага ўзмацненьня каапэрацыі і мясцовага бюджэту.

На лініі каапэрацыі трэба адмовіцца ад выдачы дэвідэндаў. Прыбытак, за выключэньнем неабходных адлічэньняў на культурна-асьветную работу, на каапэраваньне беднаты і на спэцфонды, павінен цалкам і поўнасьцю быць далучаны да асноўнага капіталу таварыства. Акрамя таго, трэба кожнаму найшчыку напружыць усе намаганьні, каб запляціць сваю паявую нядоімку. **Кампанія па папаўненьні паявога капіталу павінна быць праведзена ў самы кароткі тэрмін, у самым ударным парадку.**

Побач з гэтым належыць прывучыць селяніна да сыстэмы мэтавых авансаў. Трэба, каб ён зразумеў, што такім авансам ён забясьпечвае павялічэньне прадукцыі, прысьпяшэньне звароту і, значыць, задаваленьне яго неабходных патрэбам. **Сыстэму мэтавых авансаў належыць ужываць у шырокім разгорнутым выглядзе.** У гэтых адносінах, як і ў адносінах папаўненьня паявых узносаў, каапэрацыйныя арганізацыі павінны праявіць дух спаборніцтва. Ясна, што той каапэратыў, які лепш працуе, які больш цесна зьвязаўся з сялянствам і заслужыў давер'е мас,—лягчэй за ўсё і больш усяго зьбярэ мэтавых узносаў. **Па суме сабраных мэтавых узносаў і паявога капіталу і па тэмпе гэтай работы можна будзе меркаваць аб дзейнасьці каапэратыву і аб характары яго актыву.**

У няменшай меры сялянства і сельская каапэрацыя зацікаўлены ў падтрыманьні мясцовага савецкага бюджэту. З гэтага пункту погляду неабходна з асаблівай энэргіяй праводзіць разьмяшчэньне 100 мільёнаў сялянскай пазыкі. Акрамя тых выгад, якія пазыка прадстаўляе кожнаму паасобнаму пакупцелю аблігацый (акрамя вялікага процанту і вялікай колькасьці выйгрышаў), **пазыка гэта мае выключна важнае для сялян значэньне.** Папершае, 10 проц. сумы пазыкі застаецца на ўзмацненьне мясцовага бюджэту сельскіх і валасных саветаў. Купляючы аблігацыю, кожны селянін тым самым робіць узнос на мясцовыя патрэбы, на дарожнае будаўніцтва, на зямлеўпарадкаваньне і г. д. Падругое, рэшта—90 проц. сабранай па пазыцы сумы пойдуць выключна на ўзмацненьне сялянскай гаспадаркі, галоўным чынам, праз каапэрацыю. Узмацняючы каапэрацыю, селянін узмацняе самаго сябе, сваю ўласную гаспадарку. Падпісваючыся на пазыку, ён дапамагае каапэрацыі справіцца з фінансаваньнем усё ўзрастаючага звароту і з здавальненьнем усё ўзрастаючай патрэбнасьці земляробства на больш высокай тэхнічнай і сацыяльнай базе.

Каапэрацыйныя арганізацыі на сяле павінны стаць найбольш энэргічнымі праваднікамі сялянскай пазыкі, найбольш гарачымі прапаведнікамі тэй ідэі арганізаванай самадапамогі сялянству, якая заложана як у «пазыцы для ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі», так і ў плянамерным каапэраваньні вытворцаў і спажыўцоў сялян.

Яшчэ аб экспарце.

Пытаньне аб экспарце—пытаньне надзвычайна важнае. Камісія па садзейнічаньні экспарту, якая ўтварылася пры Эканамічнай нарадзе БССР, сьцьвярджае неабходнасьць выяўленьня ўсіх рэсурсаў Беларусі, якія могуць быць выкарыстаны ў мэтах экспарту.

Каапэрацыя—найважнейшая арганізацыя, якой дана права весьці загатоўкі ўсялякага роду сырцу, як экспартнага, так і ня экспартнага, да гэтага часу зьвяртала невыстарчальную ўвагу на гэтае пытаньне. Мы маглі-б прывесьці цэлы рад яскравых прыкладаў, з якіх выяўляецца, што каапэрацыя не заўсёды прадавала свой тавар беларускім арганізацыям. Яшчэ зусім нядаўна патрабавалася ўмяшацельства раду кіруючых органаў, каб узбудзіць каапэрацыю адносіцца да экспартных заданьняў больш сур'ёзна.

Мы ведаем, што наша Беларусь багата грыбамі, Беларусь дастаўляе грыбы ў колькасьці 60 проц. усяго таварнага вываву грыбоў СССР, а між тым экспартны плян па грыбох ня выкананы на 100 проц., бо часта каапэрацыйныя арганізацыі здавалі грыбы іншым закупшчыкам.

Тое-ж самае можна сказаць і ў адносінах да чарніц, шчаціны і іншых экспартных тавараў.

Зараз адбываецца цэлы рад нарад па ўзмацненьні экспарту. Прадстаўнікі Белдзяржгандалю, Наркамгандалю БССР знаходзяцца на раёне для высьвятленьня раду пытаньняў, зьвязаных з павялічэньнем экспарту.

Трэба ў значна большай меры прыцягнуць сельска-гаспадарчую і спажывецкую каапэрацыю да справы экспарту. У сучасны момант—разгар загатоўкі валакна (лён і кудзеля); неабходна ў адносінах да гэтых загатовак каапэрацыі выявіць максымум напружаньня. Трэба пры гэтым падкрэсьліць, што ў першым квартале ўвесь загатоўлены экспартэрамі лён быў зданы мясцовай прамысловасьці і цэнтральным фабрыкам СССР, але пачынаючы з другога кварталу, лён павінен быць экспартаваны, і ў гэтай справе каапэрацыя павінна прыняць самы актыўны ўдзел.

Дзякуючы экспарту ўдасца прывозіць у БССР большую колькасьць прамтавараў і земляробскіх прылад, у якіх некаторыя раёны маюць надзвычайна вялікую патрэбу.

Пры ўзмацненьні загатоўчай работы каапэрацыі побач з іншымі загатоўцамі няма сумненьня, што мы выканаем наш экспартны плян на ўсе 100 проц.

Леўскі.

Патаемная адпраўка зброі праз Нямеччыну.

БЭРЛІН. 10. Агэнтцтва «Вольфа» паведамляе: „У Хольтэнау стаяў нарвэскі параход „Ака", які павінен быў пагрузіць прывезеныя ў Кіль з Гале 16 вагонаў грузу, які складаўся, як заяўлялася, з машынных частак.

У часе пагрузкі прадстаўнік мытнае ўправы патрабаваў узоры грузаў і выявіў, што груз складаецца з вайсковых прылад і зброі. Пагрузка была спынена, а ўжо перавезеная на параход частка грузу—выгружана. Зброя канфіскавана нямецкаю мытнаю ўправаю. Пакуль дакладна ня выяўлены ні пункт адпраўкі грузу, ні дакладны адрас прызначэньня. Лічаць, адна, што груз—чужаземнага паходжаньня і накіроўваўся ў Осла. Параход «Ака», частка грузу якога складалася з выбуховых матар'ялаў для горнае прамысловасьці, вышаў у аўторак у Осла".

КІТАЙСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ ПЕРАМОЖА.

На зьмену забітым барацьбітом нараджаюцца новыя рэвалюцыйныя кадры.

ПАСЬПЯХОВАЯ БАРАЦЬБА „ЧЫРВОНЫХ ПІК" НА ПОЎНАЧЫ КІТАЮ.

МАСКВА, 10. Сёньня ў Маскве адбыўся шматлюдны мітынг пратэсту супроць зьдзекаў над кітайскімі рэвалюцыянэрамі. Мітынг быў арганізаваны ЦК МОПР'у і ўсесаюзным таварыствам «Рукі прэч ад Кітаю». З вялікім дакладам аб рухаючых сілах кітайскае рэвалюцыі выступіў т. Лазоўскі.

— Ня гледзячы на задушэньне рэвалюцыйнага руху,—сказаў т. Лазоўскі,—няма ніякае падставы лічыць, што контр-рэвалюцыя ў Кітаі перамагла. Кітайская рэвалюцыя мае вялізарны рэзэрвуар новых рэвалюцыйных сіл. На зьмену сотням тысяч рэвалюцыйных барацьбітоў, якія патоплены ў крыві, параджаюцца ўсё новыя і новыя рэвалюцыйныя кадры. Кітайская рэвалюцыя жыве і яна пераможа. З прывітаньнямі кітайскім рэвалюцыянэрам і выказаньнем братэрскае салідарнасьці выступілі прадстаўнікі польскае кампартыі, кампартыі Заходняй Беларусі і кампартыі Індыі.

У рэвалюцыі мітынгу, ухваленай аднагалосна, зьмешчан заклік да ўсіх рабочых і сялян Саюзу і ўсёй савецкай грамадзкасьці зьвярнуць усю ўвагу кітайскай рэвалюцыі і накіраваць усе сродкі на дапамогу паўстаўшаму кітайскаму народу.

* * *

ПЕКІН, 9. Доказам таго, што рэвалюцыйны рух у Кітаі, ня гледзячы па жорсткі тэрар і крывавую расправу, ня толькі ня зьменшыўся, а ўсё пашыраецца і ахоплівае новыя месцы, зьяўляецца ўзмацненьне дзейнасьці сялянскіх паўстанчых атрадаў на поўначы Кітаю. Як паведамляюць з Мукдану (Манчжурыя), паўстанчы атрад сялянскай арганізацыі «Вялікіх пажоў» у ліку 400 чалавек напаў на горад Дунхуа і прымусіў палацыю пакінуць горад. Бой паміж паўстанчым і ўрадавым войскам працягваўся тры дні. «Чырвоныя пікі» атрымалі рашучую перамогу над урадавым войскам. Мукдэнскія ўлады сур'ёзна занепакоены створаным становішчам.

Нямецкія рабочыя рыхтуюць адпор капіталу.

8-гадзінны працоўны дзень—яўчным парадкам.

БЭРЛІН, 10. Як мы ужо паведамлялі, нямецкія прафбюракраты, правадыры саюзу мэталістых, ідуць на згоду з прадпрыемцамі і ўрадам. Правадыры саюзу зрадзілі інтарэсам нямецкіх мэталістых і згадзіліся з настановаю трацейскай урадавай камісіі аб даўжыні рабочага дня. Паводзіны правадыроў выклікаюць абурэньне сярод шырокіх рабочых мас, якія самі пачынаюць арганізоўвацца і зьбіраць сілы для адпору наступу прадпрыемцаў. Агульны сход членаў мясцовай арганізацыі саюзу мэталістых у Рэйнгрэне і сход [illegible] каў у Дуйсбургу ўхвалілі прапанову левай прафсаюзнай меншасьці аб утваранні бадзнога саюзу паміж мэталістымі, горнарабочымі і чыгуначнікамі. Прынятыя на сходах рэзалюцыі лічаць неабходным зараз-жа пачаць падрыхтоўчую працу, каб з 1-га красавіка гэтыя саюзы маглі пачаць сумесную барацьбу з наступам прадпрыемцаў.

У Саксоніі мэталістым таксама упарта змагаюцца за 8-гадзінны працоўны дзень, ня гледзячы на здрадніцтва правадыроў. Міністэрства працы абвясьціла абавязковую трацейскую настанову ў саксонскай мэталяпрамысловасьці, згодна якой уводзіцца нядзельная зьмена. Прадстаўнікі рабочых адхілілі гэтую настанову і яўчным парадкам устанаўляюць 8-гадзінны працоўны дзень.

Англія павялічвае паветраныя сілы ў Індыі

ЛЁНДАН, 10. Паведамляюць, што вайскова-паветраныя сілы Індыі папаўняюцца яшчэ 24 новымі самалётамі, з якімі колькасьць ангельскіх вайсковых самалётаў у Індыі дасягне 96.

30.000 ЧЭХА-СЛАВАЦКІХ ШАХЦЁРАЎ ПАГРАЖАЮЦЬ ЗАБАСТОЎКАЮ.

ПРАГА, 10. У чэха-славацкай горнай прамысловасьці таксама насьпявае канфлікт. Дэлегацкая канфэрэнцыя горнарабочых Брунскага раёну па здабываньні бурага вугалю аднагалосна ўхваліла пастанову аб скасаваньні калектыўнага дагавору з 5-га лютага. Канфэрэнцыя адначасова пастанавіла, у зьвязку з ростам дарагоўлі, дамагацца павялічэньня заработнае платы на 20 проц. Калі да памянёнага вышэй тэрміну канфлікт ня будзе ўладжан, пачнецца забастоўка, якая ахопіць 30.000 рабочых.

Кандыдатура Носке выклікае разгалосьсі ў радох с.-д.

БЭРЛІН, 10. Пытаньне аб кандыдатуры Носке на надыходзячых выбарах у рэйхстаг выклікала рэзкае разгалосьсе ў радох нямецкае с.-д. партыі. Памэранскі акруговы камітэт с.-д. партыі пастанавіў прасіць ЦК, каб кандыдатура Носке ня была высунута. Сац.-дэм. „Дрэзднэр Фольксцайтунг" піша, што звычайны такт павінен быў прымусіць Носке адмовіцца ад сваёй кандыдатуры, каб не выклікаць разгалосьсю ў унутры партыі.

Фінансавыя цяжкасьці мукдэнцаў.

ПЕКІН, 9. Мукдэнская камандаваньне перажывае надзвычайныя фінансавыя цяжкасьці. Рэсурсы трох усходніх правінцый вычарпаны. Чжан Цзо-лін загадаў кіраўніцтву Пекінска-Мукдэнскай чыгункі даставіць 3 мільёны даляраў, у зьвязку з чым кіраўніцтва чыгункі намерана арабіць дзесяціпроцантнае вылічэньне з заработку служачых за сьнежань і студзень месяцы.

Французскі ўрад патрабуе выдачы камуністычных дэпутатаў.

ПАРЫЖ, 10. Агэнцтва „Гавас" паведамляе, што французкі ўрад цьвёрда рашыў дамагацца арышту камуністычных дэпутатаў, якія не зьявіліся адбываць турэмнае зьняволеньне. Прадстаўнікі ўраду выступіць у палаце і паставяць пытаньне аб даверы. Пастанова французкага ўраду настойваць на арышце прыгавораных да турэмнага зьняволеньня камуністычных дэпутатаў сустракае супярэчаньне з боку прэзыдыуму палаты. Апошняя лічыць, што вызваленыя палатаю дэпутаты ня могуць быць арыштаваны раней скавчэньня тэрміну поўнамоцтваў парляманту, г. зн. раней 1-га чэрвеня. Урад ужыў меры, каб арыштаваць дэпутатаў у выпадку іх зьяўленьня ў палаце. Абмеркаваньне палатаю пытаньня аб камуністычных дэпутатах адкладзена да 12 студзеня.

У Англіі спынілі працу яшчэ 9 домн.

ЛЁНДАН, 10. У зьвязку з крызысам у шатляндзкай мэталяпрацоўчай прамысловасьці спынены яшчэ 9 домн. У Шатляндыі застаецца толькі 22 дзейнічаючыя домны.

Кангрэс інтэрнацыяналу бязбожнікаў.

Кангрэс ганьбіць сацыял-дэмакратычных підэраў.

БЭРЛІН, 10. На заключным пасяджэньні кангрэсу інтэрнацыяналу бязбожнікаў аднагалосна абраны прэзыдыум, у склад якога ўвайшоў і т. Лукашэўскі (СССР). Рэзалюцыя кангрэсу аб міжнародным становішчы рэзка асуджае сацыял-дэмакратычных лідэраў за патры маньне імі імпэрыялістычных узброеньняў, за барацьбу супроць СССР і за нацыяналістычную палітыку прыгнечаньня, а таксама за зрыў тактыкі адзінага фронту працоўных. З іншых пастаноў кангрэсу трэба адзначыць зварот кангрэсу да ўсіх урадаў з просьбаю адмяніць абавязковае выкладаньне рэлігійных прадметаў у школах.

СЛАБАЕ ПАСТУПЛЕНЬНЕ ПЛАЦЯЖОЎ па акладным страхаваньні.

Неабходна ўжыць меры да 100-процантнага спагнаньня плацяжоў.

Усяго па сельскім акладным страхаваньні па БССР на 1927-28 год было налічана акладаў і нядоімак на суму 4.607.000 р.

З гэтае сумы памячалася прадаставіць ільготы сялянскай беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам і г. д. на суму 520.000 р.

Такім чынам, навінна паступіць 4.087.000 руб. На 1-га студзеня 1928 г. павінна было паступіць ня менш 50 проц. налічаных плацяжоў, паступіла-ж, паводле няпоўных даных, 35 проц. У мінулым годзе паступіла за гэты час 46,8 проц.

На апошнім пасяджэньні праўленьні Белдзяржстраху, дзе быў заслуханы даклад аб ходзе збораў акладных страхавых плацяжоў, адзначана слабае паступленьне гэтых плацяжоў і нявыплата вызначаных процантаў у тэрмін.

Горш за ўсё паступаюць зборы па Мазырскай акрузе—22,3 проц., па Менскай—29,9 проц., па Віцебскай—31,5 проц. і г. д.

Райвыканкомы, на якіх пасяжановаю ўраду ўскладзена спагнаньне страхавых плацяжоў, слаба кіравалі ходам кампаніі. Былі выпадкі простага невыкананьня дырэктыў ураду.

Акруговыя і раённыя выканкомы, органы дзяржстраху на месцах павінны ўжыць самыя рашучыя меры да поўнага стопроцантнага спагнаньня страхавых плацяжоў. Трэба памятаць, што гэта зьяўляецца адной з важнейшых нашых задач.

К.

Мерапрыемствы для пашырэньня беларускага экспарту.

(На пасяджэньні Наркамгандлю БССР).

Пры Наркамгандлі БССР адбылося спэцыяльнае пасяджэньне з удзелам упоўнаважанага Савету Працы і Абароны тав. Гінзбурга і прадстаўнікоў усіх экспартных арганізацый для абмеркаваньня пытаньня пашырэньня беларускага экспарту ў 1928 годзе.

Па Кішпрамгандлі ўстаноўлена, што ня ўвесь запас кішак выкарыстоўваецца для экспарту. Пастаноўлена ў большай меры абхапіць кішачны рынак, асабліва сьвіных кішак.

Белдзяржкіно даручана павялічыць вытворчасьць кіно-фільмаў для прасоўваньня іх на замежныя рынкі. Пастаноўлена ўзбудзіць хадайніцтва перад Саюзным Саўнаркомам аб арганізацыі ў Бэрліне генэральнага прадстаўніцтва па абслугоўваньні нацыянальных кіно-арганізацый па рэалізацыі кіно-фільмаў.

Работа **Белмэдгандлю** па выкананьні экспартнага заданьня прызнана слабай. Белмэдгандлю даручана арганізаваць кадр вборшчыкаў па паасобных відах лекавага сырцу.

Даны спэцыяльныя даручэньні па пашырэньні экспарту Белсельтрэсту, Белджяржвыдавецтву, Лесахіму і Беларускаму саматужна-прамысловаму саюзу. Прызнана неабходным распрацаваць мерапрыемствы па стымуляраваньні павялічэньня загатоўкі смалапрадуктаў як саматужнымі арцелямі, так і паасобнымі саматужнікамі.

Белмясгандлю даручана загатовіць на менскай і другіх бойнях 15.000 пудоў стандартнага сала для экспарту. Белмясгандлю таксама прапанавана паслаць за граніцу ўзоры рагоў, капытаў і касьцей для вывучэньня мажлівасьці іх экспарту.

Белхарчтрэсту даручана ў від е воныту адправіць у Рыгу партыю дражджэй.

Пастаноўлена на бліжэйшым пасяджэньні экспартнай нарады пры Эканомнарадзе БССР паставіць пытаньне аб разьвіцьці рыбнай гаспадаркі ў мэтах арганізацыі экспарту рыбных прадуктаў.

Вываз лесу ў Нямеччыну.

БАБРУЙСК. Адд яленьне Лесбелу загатовіла 25.000 куб. фут. лясного матар'ялу для вываву яго за граніцу.

10 га студзеня ў Бабруйск прыехала качісія нямецкіх фірм для прыёмкі гэтага матар'ялу.

Усяго ў Нямеччыну будзе накіравана з Бабруйшчыны 65.000 куб. фут. лесу.

Перайшлі на 10-рублёвы пай.

ВІЦЕБСК. Заканчваецца перавыбарчая кампанія ў нізавой спажывецкай каапэрацыі акругі. Перавыбары закончыліся ў 25-ці нізавых каапэрацыйных таварыствах. Большасьць з іх поўнасьцю перайшла на 10-рублёвы пай. Некаторыя з таварыстваў не перайшлі на 10-рублёвы пай таму, што існаваўшы да гэтага часу пай быў вельмі нізкі.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ.

Стан хлебазагатовак ў Сібіры.

НОВАСІБІРСК, 11. За апошнюю дэкаду сьнежня ўзровень хлебазагатовак у ўсходніх раёнах Сібіры заставаўся амаль на ўзроўні загатовак у другой дэкадзе. У заходніх акругах Сібіры колькасьць загатоўленага хлеба зьменшылася. Увогуле, у Сібіры за мінулую дэкаду загатоўлена 2.840.000 пуд. замест 3.370.000 пуд. за ранейшую. Затрыманьне загатовак зьвязана ў прыватнасьці з павялічэньнем другіх загатовак. У некаторых раёнах работа вялася марудна. Між тым, налічча хлеба ў сялян зусім забясьпечвае выкананьне загатоўчых плянаў.

* * *

ПЯЦІГОРСК, 10. Першая пяцідзёўка студзеня дала павялічэньне хлебазагатовак у параўнаньні з ранейшым на 33 проц. Ёсьць надзея на далейшае ажыўленьне кампаніі.

* * *

МАСКВА, 10. Па ўсіх раёнах Саюзу наглядаецца ажыўленьне хлебазагатовак. У сьнежні ўсяго загатоўлена 679.909 тон хлебапрадуктаў. За першыя пяць дзён студзеня, паводле няпоўных даных, загатоўлена 117.379 тон хлебапрадуктаў. Усяго ад пачатку кампаніі да 5-га студзеня загатоўлена 5.823.294 тоны хлебапрадуктаў.

* * *

ПАЛТАВА, 10. Эканомаддзел ДПУ арыштаваў 10 прыватных гандляроў, якія скупляілі збожжа па ўзвышаных цэнах і перамовалі варно пад відам сялянскага.

Як селянін Карнілаў скарыстаў свой выйгрыш.

ТОМСК, 11. Селянін Карнілаў, які выйграў у тыражы другой сялянскай пазыкі 1000 руб., на 500 руб. купіў сэртыфікатаў, на 250 руб. аблігацый пазыкі індустрыялізацыі і 250 руб. палажыў на бягучы рахунак для куплі аблігацый іншых пазык.

Тав. Акупаў—новы старшыня Ўсеукраінскага савету прафсаюзаў.

ХАРЬКАЎ, 10. Прэзыдыум ЦСПС Украіны пастанавіў здаволіць просьбу Радзінка аб звальненьні яго ад абавязкаў старшыні ЦСПС Украіны. Новым старшынёю ЦСПСУкр. абраны Акулаў—старшыня ўсеукраінскага камітэту прафсаюзаў горнарабочых.

Разьмяшчэньне пазыкі ўмацаваньня.

НОВАСІБІРСК, 11. Сібір пачала падрыхтоўчую працу па разьмяшчэньні пазыкі ўмацаваньня сялянскае гаспадаркі. З большасьці акруг краю ўжо атрыманы папярэднія заяўкі. Найбольшую заяўку ў 650.000 р. дала Новасібірская акруга. Агульная сума заявак дасягае 2,5 мільёнаў руб.

Тэкстыльныя фабрыкі—на 7-гадзінны працоўны дзень.

МАСКВА. У ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў адбылася нарада прадстаўнікоў губаддзелаў і прадстаўнікоў фабкомаў з усіх фабрык, якія, паводле пастановы ўрадавае камісіі, пераводзяцца на 7-гадзінны рабочы дзень. Удзельнікі нарады выказалі катэгарычнае патрабаваньне, каб увядзеньне 3-е зьмены і пераход на 7-гадзінны працоўны дзень былі праведзены ў тэрмін, г. з. 15 студзеня 1928 году.

Для трэцяе зьмены ў першую чаргу павінна быць скарыстана рабочая сіла, якая вызваляецца пасьля рацыяналізацыі працы на данай фабрыцы. Уся іншая патрэба ў рабочай сіле павінна задавальняцца за кошт пераросткаў і беспрацоўных членаў сямей тых тэкстыльшчыкаў, якія працуюць на дачных прадпрыемствах. Нарада намеціла таксама рад іншых мерапрыемстваў. Для больш шпаркага ажыцьцяўленьня ўсіх намечаных мер ЦК вылучыў 9 адказных таварышоў, якія выяжджаюць на месцы.

Бірзупа—цэнтр Малдавіі.

БАЛТА, 10. Урад Малдавіі на нарадзе пастанаў усемалдаўскіх зьездаў саветаў і сходаў рабочых і сялян пастанавіў перанесьці цэнтр Малдавіі з Балты ў Бірзулу. Ранейшы цэнтр Балта мае рад навыгод, у прыватнасьці ў Балце востры кватэрны крызіс. Бірзула зьяўляецца эканамічным цэнтрам цягненьня некалькіх раёнаў Малдавіі і вялікай вузлавой станцыяй.

„Філёзофія" вайны.

Новая кніга намесьніка начальніка генэральнага штабу Англіі палкоўніка Фулера.

Цікава пазнаёміць нашага чытача з кнігаю намесьніка начальніка генэральнага штабу Англіі палкоўніка Фулера, якая вышла нядаўна ў Англіі і названа ім „Перагаварыцьце вайны". Гэта кніга адзначае сабою вельмі рэзкую адмову пануючых клясаў сучаснай Англіі ад нацыфіскай балбатні ў бок адкрытай і наглай апалёгіі вайны, яе нямінучасьці, неабходнасьці і „ачышчаючай" ролі.

Цяпер нельга ўжо завабіць масы на вудачку нацыфіскіх ілюзій, нельга больш апраўдваць свае ваенныя падрыхтаваньні злымі намерамі сваіх суседзяў, бо масы добра бачаць, як ня хоча разбройвацца піводная імпэрыялістычная дзяржава. У працэсе бязупынных таргоў і пэраторгаў наконт разброеньня імпэрыялістычныя газэты ўсіх краін дагала выкрываюць адна другую.

Адгэтуль з відавочнаю няўхільнасьцю для імпэрыялістычнай буржуазіі вынікае неабходнасьць вядомай палітычнай устаноўкі, вядомай тэорыі, „філёзофіі", якія-б апраўдвалі надзвычайныя выпярэдніцтвы ў справе ўзброеньня і нямінучую ваенную сутычку. У гэтым плане і заключаюцца адкрытыя прамовы ангельскіх міністраў пасьля правалу папярэдняй сэсіі камісіі Лігі Нацый па разброеньні.

Але ў ролі сапраўднага „філёзафа" гэтай устаноўкі выступае вышэй памянёны палкоўнік Фулер.

Вось што ён піша:

„Асноваю чалавечага жыцьця зьяўляецца барацьба за існаваньне, а формаю гэтай барацьбы—вайна. Хоць чалавек і жадае міру, але сапраўдным законам жыцьця зьяўляецца вайна. Гэты закон вядомы, і ніхто ня зможа зьмяніць яго. Чалавек ня мае права на жыцьцё, ён мае толькі сілу на забойства і такім чынам захоўвае свае жыцьцё. Людзі заўсёды застануцца людзьмі, і вайна—законам іх жыцьця. Бясспэчны і дарэмны думкі тых, хто спадзяецца, што эпоха войн зьменіцца эраю вечнага міру".

Есьць месцы ў кнізе яшчэ больш агідныя і цынічныя:

„Жыцьцездольныя нацыі перамагаюць і карыстаюцца асаладой ад сваіх перамог. Выжываньня—заваёўваюцца, і калі нават яны будуць зьведзены, дык зусім заслугоўваюць свайго лёсу...

...Праліі кроў блізкага свайго, інакш ён праліе тваю."

Далей ідуць дыфырамбы вайне:

„Вайна—найвялікшая з дабрачынасьцяй, вялікі дактар, вялікае лякарства. Кожная нацыя час ад часу мае патрэбу ў вайне, каб ачысьціцца ад нечысьці і мірнага перыяду. Калі прырода набудавала так, што мэнструацыі зьяўляюцца законам нармальнага жаночага разьвіцьця, дык ці ня ўпоўнай згодзе з законамі прыроды зьяўляецца вайна?"

Фулер улічвае і абвастраньне клясавай барацьбы ў часе вайны. Як гэтага ня ўлічыць!

А далей ён піша:

„Каб разагнаць мітынг, досыць накрапіць чыхацельным газам, а супроць паўстаўшых рабочых можна ўжыць газ, які выклікае колікі".

Салдафон Фулер усё-ж „забыў" упусьціці некаторую яснасьць у пытаньні, што „сапраўдным законам у жыцьці зьяўляецца вайна".

Спрачацца аб гэтай тэорыі на сёньнешні дзень ніяк нельга, бо мы навучаны практыкаю, што да таго часу, пакуль ня будзе зьнішчан капіталізм, войны няўхільны.

Тэорыя Фулера не зьяўляецца новай. Пануючыя клясы заўсёды будуць гаварыць аб такой тэорыі. Але калі зараз аб гэтым прыходзіцца гаварыць і так адкрыта, дык гэта завячае на абвастраньне клясавае барацьбы ў „старой добрай Англіі".

НЯМЕЦКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ ПЕРАД БОЕМ.

Бліжэйшыя месяцы будуць сьведкамі грандыёзных баёў паміж нямецкімі рабочымі і прамыслоўцамі. Становішча рабочага ў Нямеччыне ў сучасны момант больш цяжкае, чым у якой-бы то ні было іншай краіне. Аднак, прашлі ўжо тыя часы, калі можна было прымусіць нямецкага рабочага працаваць за жабрацкую заработную плату па 9—10 гадзін у сутки, спасылаючыся на крытычнае становішча нямецкае народнае гаспадаркі, разбуранай вайной і непасільнымі рэпарацыямі. Цяпер нямецкая прамысловасьць перажывае пэрыяд уздыму, справы прадпрыемцаў паляпшаюцца, і патрабаваньні нямецкага рабочага аб павышэньні яго жыцьцёвага ўзроўню становяцца ўсё больш настойлівымі. Пад знакам росту баявых настрояў нямецкага пралетарыяту адбываўся канфлікт, які і цяпер яшчэ ня скончыўся ў буйной жалезавырабчай прамысловасьці. Расьце гатоўнасьць да барацьбы нямецкага рабочага і ў іншых галінах прамысловасьці.

Вясною 1928 году канчаецца тэрмін калектыўных дагавораў у большай частцы буйных прамысловых галін Нямеччыны. Няма ніякага сумненьня ў тым, што заключэньне новых дагавораў будзе адзначана жорсткімі баямі паміж рабочымі і прадпрыемцамі.

Ацэньваючы пэрспэктывы надыходзячых баёў, належыць мець на ўвазе набліжэньне выбараў у нямецкі рэйхстаг. Нямецкія сацыял-дэмакраты, да якіх належыць большасьць прафсаюзных правадыроў, у пагоні за галасамі будуць прымушаны зьмяніць сваю звычайную тактыку сабатажу рабочых патрабаваньняў і больш ці менш рашуча стаць начале руху рабочых за павышэньне іх жыцьцёвага ўзроўню. У гэтым-жа напрамку будуць дзейнічаць і баявыя настроі нямецкага пралетарыяту, якія штурхаюць прафсаюзных правадыроў да больш рашучых дзеяньняў.

Правыбарчая сытуацыя будзе мець уплыў бясспрэчна і на пазыцыю прадпрыемцаў. Звычайна няўступчывыя, гатовыя біцца да апошняга з-за кожнага пфэнігу на павялічэньне заработнай платы і кожнай хвіліны, якая зьмяншае рабочы дзень, прадпрыемцы на гэты раз, быць можа, пойдуць на некаторыя ўступкі, якія пасьля выбараў пастараюцца адабраць.

Стабілізацыя народнай гаспадаркі, а з ёю і палітычнага ўплыву сацыял-дэмакратыі ў выніку сваім будуць мець рад затрудненьняў для рабочае клясы. Сацыял-дэмакратычныя правадыры прафсаюзаў, адчуваючы пад нагамі цьвёрдую глебу і не палохаючыся таго, што кіраўніцтва можа высьлізгнуць з іх рук, як гэта было ў 1923 годзе, будуць карыстацца большаю свабодаю дзейнічаньня, чым калі-б то ні было і пастараюцца выкарыстаць гэтую свабоду для таго, каб урэзаць патрабаваньні рабочых.

У надыходзячай барацьбе сацыял-дэмакраты пастараюцца аддаць перавагу і прытрымлівацца тактыкі перадачы канфліктаў на выраішэньне ўрадавай трацейскай інстанцыі, як гэта яны ўжо практыкавалі пры канфлікце ў жалезавырабчай прамысловасьці. Ня выключана, аднак, што прафсаюзныя правадыры пад націскам абставін будуць прымушаны рашыцца на больш сьмелыя крокі і стануць начале забастовачнага руху.

А. Віль.

У Польшчы.

Новы дэкрэт аб абмежаваньні свабоды друку.

ВАРШАВА, 10. У зьвязку з набліжэньнем выбараў у сойм, урад імкнецца параліжаваць дзейнасьць палітычных партый. Агалошан дэкрэт прэзыдэнта, які абмяжоўвае свабоду друку ў яшчэ большай ступені, чым скасаваны соймам ранейшы дэкрэт. Дэкрэт абараняе ўрад, генэралітэт і чыноўнікаў ад выступленьняў супроць іх у друку.

Пілсудчына і манархістыя.

ВАРШАВА, 10. Як ужо паведамлялася, у Польшчы ўтварыўся «беспартыйны блёк супрацоўніцтва з урадам». „Беспартыйнасьць" блёку—толькі масканаванне. Сапраўды-ж—гэта блёк пілсудчыны.

Гэтымі днямі Пілсудзкі прыняў князя Яруша Радзівіла, з якім доўга гутарыў наконт удзелу манархістых у блёку.

Дэманстрацыя ў залі суду.

ВАРШАВА, 10. У акруговым судзе разглядалася справа Мілеўскага і Левандоўскай, якія абвінавачваліся ў арганізацыі дэманстрацыі ў залі суду ў часе працэсу вядомага польскага камуністага Пурмана. Калі на судзе было абвешчана аб новым адтэрмінаваньні працэсу, падсудныя зрабілі дэманстрацыю, да якой далучыліся шмат людзей з публікі і сем'і падсудных, якія прысутнічалі ў залі. Акруговы суд прыгаварыў Мілеўскага да 6 мес. турмы, а Левандоўскую да 10 дзён.

Саюз пегіянэраў—за супрацоўніцтва з „беспартыйным" блёкам.

ВАРШАВА, 10. 6-га студзеня адбыўся пасяджэньне галоўнае управы саюзу легіянэраў прысьвечанае выбарнай кампаніі. На пасяджэньні абмяркоўвалася пытаньне аб адносінах да беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам.

Пастаноўлена наладзіць сталыя адносіны з блёкам.

Украінцы на выбарах.

ЛЬВОЎ, 10. Украінскі народны саюз пастанавіў высунуць 42 кандыдаты на выбарах у сойм і сэнат.

Сярод кандыдатаў 25 сялян.

ЗАХ. БЕЛАРУСЬ

Да працэсу Грамады.

ВІЛЬНЯ, 9. Арыштаваныя раней, у зьвязку з працэсам Грамады, віленскі беларускі настаўнік Шнаркевіч, а таксама сьвяшчэньнік Коўш, вызваленыя праз нейкі час, зараз зноў арыштаваны. Як паведамляе газэта „Вільнэр Тог", агульны лік сьведак, якія выступяць на працэсе Грамады, дасягае 1500 чалавек.

Два месяцы турмы за газэтны артыкул.

ВІЛЬНЯ, 9. У Віленскім акруговым судзе разглядалася справа рэдактара яўрэйскае газэты „Вільнэр Тог" Рэйзіна які нездаўна паведаў СССР. Рэйзін прыцягваўся да адказнасьці за газэтны артыкул аб прымусовым нядзельным адпачынку для яўрэйскіх гандляроў і саматужнікаў. Суд прыгаварыў Рэйзіна да 2-х месяцаў турмы. На другі дзень пасьля зьявілася ў памяшканьне рэдакцыі і канфіскавала ўсе нумары газэты за зьмяшчэньне справаздачы аб судзе для Рэйзіна.

Таксама „беларусізацыя".

ВІЛЬНЯ, 10. „Кур'ер Віленскі" паведамляе, што гэтымі днямі да віленскага арцыбіскупа Ялбжыкоўскага зьвярнулася дэлегацыя беларусаў з Жодзінскае парафіі дамагаючыся, каб набажэнствы на жодзінскім касьцёле адбываліся ў беларускай мове, бо Жодзінскую парафію насяляюць пераважна беларусы.

Арцыбіскуп згадзіўся з дамаганьнем дэлегацыі, патрабаваўшы, аднак, каб яму была падана адпаведная заява з 400 подпісаў парафіян.

44 гады астрогу.

ВІЛЬНЯ, 10. Віленская беларуская газэта „Думка Працы" паведамляе, што Пінскі акруговы суд на выязднай сэсіі ў Берасьці разглядаў справу 14 камуністых. 11 падсудных засуджаны на 4 гады астрогу кожны, 3 апраўданы.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Шаўлях.

ШАУЛІ, 10. Гэтымі днямі ў Шаўляк адбылася дэманстрацыя беспрацоўных, якая набыла палітычны характар. Паліцыя разагнала дэманстрацыю і арыштавала 20 чалавек.

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ

Партвыхаваўчая праца з кастрычнікавым заклікам.

Заўсёды, калі наша партыя перажывала асаблівыя гістарычныя пэрыяды пералому, якія суправаджаліся ўнутрыпартыйнымі разгалосьсямі, міжнароднымі ўскладненьнямі і небясьпекаю вайны для Савецкага Саюзу, рабочая кляса выручала сваю пралетарскую бацькаўшчыну і выступала застрэльшчыкам узмацненьня бальшавіцкай партыі. Да Кастрычнікавай рэвалюцыі рабочая кляса падтрымлівала і ўлівала свае лепшыя сілы ў партыю

Рабочая кляса Беларусі, у прыватнасьці Менскай акругі, не адстала ад іншых гарадоў нашага Саюзу і ў ногу з ленінградзкімі і маскоўскімі рабочымі перадала сваіх лепшых таварышоў УсеКП(б).

Да 15-га сьнежня 1927 году паступіла 788 заяў ад рабочых Менску і Барысава і сельскіх раёнаў аб уступленьні ў рады партыі, а к 1-му студзеня 1928 г. было ўжо прынята ў партыю 454 чалавекі.

Бязумоўна, што новы пласт рабочых, якія ўступілі ў партыю па кастрычнікавым закліку, у большай ступені, чым ленінскі набор, патрабуе вывучэньня ленінізму, новыя партыйцы патрабуюць сур'ёзнай апрацоўкі, узбраеньня і ўкараненьня пачатковых ведаў ленінізму, без якіх ня можа абыйсьціся піводзін камуністы.

У асноўным гэта задача нашых прапагандысцкіх кадраў партыі і лепшыя з іх, абсалютна вызваленыя ад ідэалёгічных шкодных настрояў, павінны быць кінуты на фронт для партвучобы з кастрычніковым наборам. Раённыя партарганізацыі павінны сваячасова забясьпечыць кастрычнікавы набор усім неабходным і паставіць іх у такія ўмовы, каб яны мелі поўную магчымасьць рэгулярна наведваць партыйныя школы. Асабліва гэта важна ціпер, калі рабочыя выяўляюць вялікую зацікаўленасьць да павышэньня сваіх палітычных і культурных ведаў.

Гэтую зацікаўленасьць трэба чым хутчэй і як мага лепш выкарыстаць. Доказам таго, што такая вялікая зацікаўленасьць маецца, можа служыць вялікі процант абхопу кастрычнікавага набору партыйнай асьветай.

Папярэднія вынікі абхопу партвучобай у паасобных раёнах характарызуюцца наступным чынам: па гарраёне было прынята ў партыю 120 чал., абхоплена партвучобай 56 проц., значная частка наведвала партыйныя школы до ўступленьня ў партыю, такім чынам процант абхопу значна большы.

Па Кастрычнікаўскім раёне прынята ў партыю 102 чалавекі, абхоплена школамі—90 проц. Па Ляхаўскім раёне—107 чал., абхоплена—85 проц., Барысаўскім—110, абхоплена—97 проц., па сельскім раёне—15. У абсалютных лічбах партшколамі абхоплена 375 чалавек, што складае ў адносінах да агульнага ліку 454 прынятых у партыю 85 проц.

АПА АК прыняла пастанову абхапіць поўнасьцю партыйнай асьветай кастрычнікавы заклік. Дзеля азнаямленьня яго з пастановамі 15-га зьезду УсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б будуць пастаўлены даклады аб выніках, а ў сыстэме ўсёй партвучобы на працягу 3-х месяцаў весьці праправоцоўку пытаньняў зьезду, увязваючы іх з прахаджэньнем праграмы запятку.

Другое пытаньне—пад якім кутом павінна быць накіравана ўкараненьне ведаў ленінізму для кастрычнікавага набору і пазасталай партыйнай масы.

Пастаноўка пытаньня датычыць вывучэньня тэарытычных праблем, зьвязаных з праблемамі нашай рэвалюцыі і выкрыцьця сутнасьці збанкрутаваўшай апазыцыі. Апазыцыя пераможана.

Нельга весьці сур'ёзную і глыбокую выхаваўчую работу сярод партыйных і беспартыйных толькі пад кутом практыцызму. Ленінізм не адлучае практыку ад тэорыі і тэорыі ад практыкі. Тым больш у даны адрэзак часу, калі на аснове палітычнага і культурнага росту партыйныя і беспартыйныя масы рабочых прад'яўляюць павышаныя патрабаваньні таксама і ў галіне вывучэньня тэарытычных пытаньняў.

У адносінах да новых пластоў нашай партыі — кастрычнікаваму набору—гэта адносіцца ў меншай ступені, да пазасталай партыйнай масы, якая прайшла палітпадрыхтоўку па вывучэньні тэарытычных праблем, зьвязаных з нашай рэвалюцыяй і сацыялістычным будаўніцтвам, да іх адносіцца поўнасьцю.

І. Сенін.

Аблічча кастрычнікавага закліку.

(Гомельшчына).

Кампанія кастрычнікавага заклику шырока разгарнулася ў прамысловых раёнах нашае акругі.

Рабочымі ў ячэйкі падана заяў аб прыёме ў партыю: Залінейнага раёну—342, Гарадзкога—338, Нова-Белицкага—185, Рэчыцкага—150 і парткалектыву Добрускай паняровай фабрыкі—157.

Распрацаваныя даныя, якія покуль што маюцца на 593 прынятых па кастрычнікавым закліку ў кандыдаты, гавораць аб тым, што ў партыю ўступаюць галоўным чынам кваліфікаваныя рабочыя з вялікім вытворчым стажам і што ў асноўным у партыю прышла найбольш перадавая і сьвядомая частка рабочага актыву.

96,3 проц. усіх прынятых складаюць фабрычна-заводзкія і транспартныя рабочыя, 2,7 проц. наёмныя рабочыя дробных прадпрыемстваў (будаўнікі) і 1 проц. адміністрацыйна-тэхнічны пэрсапал (майстры і інш).

Па вытворчым стажы падзяляюцца: да 3-х год—17,7 проц., ад 3 да 5 год—16,7 проц., ад 5 да 10 год—23,3 і звыш 10 год 42,3 проц. У ліку прынятых з вытворчым стажам да 3-х год камсамольцаў ёсьць 10,4 проц. у адносінах да агульнай колькасьці прынятых.

З 592 чалавек выконваюць актыўную грамадзкую работу: выбарную—278 чалавек ці 46,9 проц. і нявыбарную—202 чалавекі ці 32,2 проц.

Жанчын у ліку прынятых маецца 12,2 проц. і камсамольцаў 21,9 процантаў.

120 чалавек скончылі школу палітграматы да ўступленьня ў партыю. У сучасны момант згуртована ўвага арганізацыі на апрацоўку кастрычнікавага заклику.

Даны паказаньні нізавым арганізацыям прысьпяшыць афармленьне спраў па прыёме кастрычнікавага заклику, а таксама сельскім райкомам аб уцягненьні ў партыю сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў.

К. Пасутман.

Першы вопыт.

(Бабруйск).

Бабруйскі акругком пастанавіў на працягу студзеня месяца правесьці раённыя нарады груп беднаты ў Бабруйскім, Слуцкім і Парыцкім раёнах, на якіх павінны быць абгавораны пастановы 15-га зьезду УсеКП(б) аб рабоце ў вёсцы.

На нарады прыцягваюцца ўсе члены груп беднаты, а таксама па выбары ячэек КП(б)Б і райкомаў запрашаюцца паасобныя члены сельсаветаў, упоўнаважаныя ці члены праўленьняў і рэвізійных камісій кааперацыі, у поўнаважаныя (ці члены прэзыдыуму) КСУ і прадстаўнікі сельбатрачкомаў. Ва ўсім складзе раённай нарады павінна быць каля 60 чалавек. Пры арганізацыі нарады маецца на ўвазе забясьпячэньне прадстаўніцтва ад усіх вышэйзазначаных арганізацый. На раённых нарадах абавязкова павінны прысутнічаць кіраўнікі груп беднаты, ці сакратары ячэек КП(б)Б.

Райкомам неабходна будзе вылучыць лепшыя партыйныя сілы, якія добра ведаюць працу з беднатой, каб, выехаўшы на месцы, сумесна з парт'ячэйкаю вылучыць выбарчы бядняцкі актыў, які неабходна прыцягнуць на раённую нараду, і правесьці падрыхтоўчую работу сярод членаў груп беднаты. У гэтай рабоце прыдзецца скарыстаць і камсамольскую арганізацыю на вёсцы, асабліва там, дзе няма партыйцаў. Для дапамогі райкомам акругком камандыруе па адным свае прадстаўніку ў кожны раён.

На нарадах неабходна будзе забясьпечыць найбольшую актыўнасьць беднаты і дзедавітасьць, а таксама выразна правесьці лінію аб неабходнасьці кіруючай ролі партыі.

Выконваючы найважнейшую дырэктыву 15-га зьезду аб скліку нарад груп беднаты, нам важна ўлічыць практыку гэтай работы, каб на яе падставе ў далейшым разгарнуць такую ж работу ва ўсёй акрузе.

Сухараў.

ПАЧАТАК НОВАГА ЎЗДЫМУ.

(Да пастаноў 15-га зьезду УсеКП(б).

Правільная ацэнка становішча рэвалюцыйнага руху рабочае клясы Эўропы зьяўляецца аднэй з самых важных прадпасылак і для вызначэньня пэрспэктыў сусьветнае рэвалюцыі, і для вызначэньня тактычнае лініі Камінтэрну, і для вызначэньня ступені ваеннай небясьпекі для нас на бліжэйшы час, і, нават, для пасьпяховасьці нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Дзеля гэтага вывады, да якіх прышоў у гэтых адносінах 15-ы зьезд партыі займаюць цэнтральнае месца ў пастановах зьезду.

На пытаньні аб становішчы рэвалюцыйнага руху на Захадзе зьезд спыняўся два разы: па справаздачным дакладу тав. Сталіна і па дакладу т. Бухарына аб дзейнасьці дэлегацыі УсеКП(б) у Выканкоме Камінтэрну, і абодвы разы зьезд прышоў да адных і тых-жа вываду, сфармуляваных у рэзалюцыях зьезду наступным чынам:

«Пасьля лядоўтага пэрыяду адноснага зацішша, мы маем зараз новы ўздым рэвалюцыйнага рабочага руху і значнае паляпшэньне шырокіх рабочых мас». (Рэзалюцыя па дакладу т. Бухарына). «У сучасны момант у Эўропе паротка часовы ліквідацыі рэвалюцыйнай хвалі зьмяняецца яе прылівам, павышэньнем баявой актыўнасьці пралетарыяту, дыфэрэнцыяцыяй і паляпшэньнем рабочага руху, згуртаваньнем радоў Камінтэрну і яго сэкцый, ростам масавага рэвалюцыйнага руху»... (Рэзалюцыя па дакладу т. Бухарына).

Такім чынам, даючы ацэнку становішча рэвалюцыйнага руху на Захадзе, зьезд зусім ясна і акрэсьлена паказаў, што ў сучасны момант крывая рабочага руху не памяншаецца, а наадварот, ідзе на ўздым.

Што дало зьезду падставу для такой ацэнкі? Цэлы рад фактаў і зьявішч, якія адбываюцца за апошні час і адзначаны абодвума дакладчыкамі, як палўныя адзнакі паляпшэньня рабочых пізоў і рэвалюцыйнага ажыўленьня.

Галоўнейшыя з гэтых адзнак наступныя:

1. Рост колькасьці абраных у законадаўчыя зборы, гарадзкія думы, больнічныя касы ў Нямеччыне, Польшчы, Чэха-Славакіі і іншых краінах, камуністых, а таксама сацыял-дэмакратаў, пры чым рост камуністых адбываецца за кошт рабочых, а сацыял-дэмакратаў—за кошт дробнай буржуазіі і служачых.

2. Узмацненьне ўплыву камуністых у прафсаюзах у радзе краін (Нямеччына, Італія і Чэха-Славакія).

3. Ажыўленьне забастовачнага руху: забастоўка гарнякоў і лёкаут мэталістых у Нямеччыне, забастоўка будаўнічых рабочых у Чэха-Славакіі, шматлікія забастоўкі ў Італіі, Францыі, Польшчы, Скандынаўскіх краінах, а таксама ў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах.

4. Адкрытыя масавыя выступленьні рабочых: венскае паўстаньне, дэманстрацыя ў сувязі з пакараньнем сьмерцю Сако і Ванцці, антыфашысцкія дэманстрацыі ва Францыі і Нямеччыне, дзень чырвоных франтавікоў у Нямеччыне, выступленьні ва ўсіх краінах рабочых у зьвязку з пагрозай нападу на Савецкі Саюз, дэманстрацыя рабочых Варшавы з прычыны забойства тав. Войкава і т. д.

5. Рад іншых адзнак, як, напрыклад, хваляваньне сярод матросаў у Тулёне, хваляваньне сярод французскіх рэзэрвістых, кастрычнікаўскія дэлегацыі і т. д.

Усе гэтыя зьявішчы не зьяўляюцца чымсьці выпадковым, эпізадычным, часовым. Гэта—адбіцьцё тых працэсаў, якія адбываюцца зараз у капіталістычнай эканоміцы; гэта асабліва адзначалася дакладчыкамі па зьезьдзе.

Стабілізацыя патрабавала ўзмацненьня капіталістычнага націску на рабочую клясу. На працягу раду год рабочая кляса перажывала цяжкія часы, ледзь маючы магчымасьць абараняцца. Але зараз гэтыя горшыя часы ўжо мінулі. Унутраная супярэчнасьці самай стабілізацыі далі магчымасьць рабочай клясе ўзмацніцца і пачаць пераход ад абароны ў наступленьне.

Усе вышэй азначаныя зьявішчы—гэта пачатак мабілізацыі рабочых мас для будачага наступленьня.

«З стабілізацыі вырастае новы рэвалюцыйны ўздым».

Тут не павінна быць пераацэнкі становішча, і тав. Бухарын адзначаў у сваім дакладзе, што нельга гаварыць, «што мы стаім ужо ціпер напярэдадні непасрэдна рэвалюцыйнай сытуацыі ў Эўропе,—да гэтага справа яшчэ не дайшла. Але ўжо дайшло да таго, што пасьля пэўнага перарыву ў рабочым руху, мы маем бязумоўнае зрушэньне ў бок актыўнай барацьбы».

Апазыцыя на зьезьдзе, у асобе тав. Ракоўскага, прабавала штоцьці гаварыць аб выпадку «действенности», «актыўнасьці» рабочае клясы на Захадзе, але сама-ж сябе абвяргала ў заяве ад 18-га сьнежня, падпісанай і тав. Ракоўскім, у якой маецца ссылка на «новы ўздым хвалі рабочага руху».

У гэтым эпізодзе яшчэ раз выявіліся хістаньні апазыцыі, яе дамагагічнае фокусьнічаньне і няўменьне разабрацца ў тых складаных працэсах, якія адбываюцца і ў самой капіталістычнай стабілізацыі і ў сучасным рабочым руху.

Партыя, яе XV зьезд змаглі гэта зрабіць, і ціпер мы маем акрэсьленую ўстаноўку ўсёй палітыкі і партыі і Камінтэрну, устаноўку, адпраўным пунктам якой зьяўляецца факт «паляпшэньня, рэвалюцыянізаваньня пралетарыяту ў асноўных вузлох капіталізму». А. Я.

Пара пачаць.

ГАЛОЎНАЯ ЎВАГА АГІТКАМПАНІІ.

ПАЗЫКУ Ў ВЁСКУ.

Асноўныя задачы кампаніі.

У радзе мер, якія прымаюцца ўрадам і партыяй да хуткай ліквідацыі часовых труднасьцяй, якія намеціліся ў некаторых галінах нашай народнай гаспадаркі, асноўнае месца належыць выкананьню ў БССР кантрольнай лічбы пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Кантрольная лічба для БССР складае 2.000.000 руб. Горад параўнальна пасычан пазыкамі, асабліва пасьля правядзеньня пазыкі індустрыялізацыі, вёска-ж дагэтуль мала ўдзельнічае ў пазыках. Таму кантрольныя лічбы сялянскай пазыкі павінны быць выкананы ў асноўным вёскай.

Тэрмінам для рэалізацыі па СССР пазыкі намечан люты-красавік.

З прычыны таго, што ва ўмовах БССР у сакавіку пачынаецца бездарожжа, а ў красавіку пасеўная кампанія—павінна быць узята цьвёрдая ўстаноўка на правядзеньне кампаніі рэалізацыі пазыкі ў БССР у працягу двух месяцаў—**люты-сакавік**. Асноўная частка працы павінна быць праведзена ў лютым.

Вынікі кампаніі рэалізацыі пазыкі залежаць ад таго, наколькі мы зможам шырока растлумачыць кожнаму асобнаму селяніну значэньне пазыкі і выгады яе. Галоўная ўвага павінна быць удзелена агіткампаніі. Трэба выкарыстоўваць для гэтага ўсе віды агітацыі—друк, зьезды, сходы, хаты-чытальні і асабістую індывідуальную агітацыю.

Для правядзеньня ўсёй працы ўтвараецца рэспубліканская камісія пад старшынствам сакратара ЦВК БССР тав. Хацкевіча, акруговыя, раённыя і сельскія камісіі, а ў кожным населеным пункце выдзяляюцца ўпоўнаважаныя па правядзеньні рэалізацыі.

Рэалізацыя ў вёсцы павінна праводзіцца шляхам абходу членамі камісіі ўсіх сялянскіх двароў пасьля дастатковага растлумачэньня выгад пазыкі і яе значэньня.

Магчыма, што на першы час у Беларусі прыдзецца рэалізаваць пазыку не па аблігацыях, а па часовых квітанцыях. Справа ў тым, што тэхнічна немагчыма загатовіць на ўсю суму аблігацый да 1-га лютага. Наркам. Грашовых Спраў Беларусі ўзьняў пытаньне перад Наркам. Грашовых Спраў СССР аб прысылцы аблігацый.

Абрамсон.

Наш абавязак.

(Гутарка з членам ЦВК БССР і СССР, селянінам вёскі Пагост, Мазырскае акругі, т. Саскевічам).

Я лічу, што выпушчаная пазыка—гэта неабходнае мерапрыемства, і кожны сьвядомы селянін павінен зразумець важнасьць гэтай пазыкі і набыць аблігацыі. Гэта пазыка будзе садзейнічаць разьвіцьцю сельскай гаспадаркі і палепшыць становішча нашых бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. Без дапамогі ўсяго насельніцтва дзяржава ня зможе адпусьціць усе патрэбныя сродкі для ўзьнікцьця сельскай гаспадаркі.

Пазыка карысная.

(Гутарка з членам ЦВК БССР—рабочым саўхозу імя Хацкевіча, Барысаўскага раёну, тав. Мядзьвецкім).

— Выпускаемая сялянская пазыка—мерапрыемства вельмі неабходнае, бо толькі пры садзейнічаньні самога сялянскага насельніцтва мы зможам узьняць сельскую гаспадарку. Пазыка карысна для сялянскіх мас, яе рэалізацыя ня зьявіцца цяжарам для сялянства.

Я лічу, што сельскімі партыйнымі ячэйкамі і грамадзкімі арганізацыямі павінна быць праведзена шырокая кампанія па растлумачэньні сялянству ўсёй важнасьці гэтай пазыкі ў справе разьвіцьця сельскай гаспадаркі.

Я ўпэўнены, што сялянства зразумее ўсе выгады і ўсю важнасьць гэтай пазыкі.

Кожны двор—удзельнік пазыкі.

(Гутарка з Наркамземам тав. Прышчэпавым).

Сельская гаспадарка ў Беларусі перасягнула даваенны ўзровень разьвіцьця, але мы вельмі мала прыцягнулі вольныя сродкі сялянскага насельніцтва праз касы ашчаднасьці і пазыкі ў справу арганізацыі сялянскай гаспадаркі.

У сучасны момант, калі мы праводзім мерапрыемствы на індустрыялізацыі Савецкага Саюзу, дзяржава ня мае магчымасьці ў значных разьмерах укладваць сродкі ў сельскую гаспадарку. Такім чынам, каб разгарнуць мерапрыемствы па ўзмацненьні сельскае гаспадаркі, неабходна самая шырокая мабілізацыя сродкаў сялянскага насельніцтва, шляхам распаўсюджваньня сялянскай пазыкі.

Два мільёны рублёў для 800.000 сялянскіх гаспадарак у БССР зьяўляюцца сумай нязначнай і ў поўнай меры магчымай для поўнай рэалізацыі з прычыны таго, што ў сярэднім на сялянскі двор прыдзецца мала больш 3 рублёў.

Такім чынам, кожны сялянскі двор, уключаючы і бядняцкую гаспадарку, мае магчымасьць прымаць удзел у рэалізацыі пазыкі і гэтым садзейнічаць найхутчэйшаму разьвіцьцю сельскай гаспадаркі.

Вялікія сродкі неабходны для землеўпарадкаваньня, для мэліярацыі, агранамічных мерапрыемстваў і масавага кааперараваньня сялянства. Усе гэтыя мерапрыемствы могуць быць праведзены ў жыцьцё ў тым выпадку, калі сялянства разам з сродкамі, якія адпускаюцца дзяржавай, мабілізуе свае сродкі.

Кожны вясковы актывісты павінен садзейнічаць рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі

Аб некаторых новых мэтадах партыйнае работы ў вёсцы.

(У парадку пастаноўкі пытаньня).

XV зьезд УсеКП(б) паставіў, як чарговую канкрэтную задачу партыі на падыходзячы этап, разгортваньне будаўніцтва сацыялізму ў вёсцы на аснове аб'яднаньня раздробленае сялянскае гаспадаркі і стварэньня буйное калектыўнае гаспадаркі. На гэту асноўную задачу на працягу некалькіх год павінна быць накірована ўся практычная работа вясковых партарганізацый, да ажыцьцяўленьня гэтай задачы павінны быць прыстасованы ўсе формы работы ў вёсцы, усе вагары, якія вядуць ад партыі да сялянства.

Натуральна, што ў працэсе рэалізацыі гэтай задачы партыі, трэба ўдакладніць і ўдасканаліць існуючыя мэтады работы ў вёсцы, а таксама намячаць і выпрацоўваць рад новых форм і мэтадаў.

Адною з форм работы па арганізацыі вёскі на новых пачатках па яе культурна-гаспадарчай перабудове павінны стаць на наш погляд **вытворчыя нарады камуністых і камсамольцаў—самастойных гаспадароў**, якія трэба пэрыядычна склікаць для праправоцоўкі важнейшых пытаньняў разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Практыка такіх вытворчых нарад ужо ёсьць у радзе партыйных арганізацый СССР (Пскоўская, Архангельская, Курская і інш.). Спробы такіх вытвочых нарад былі і ў БССР (Калінінск, Слуцак), але яны ў нас яшчэ не набылі характару сталай формы работы.

У КП(б)Б на 1-га кастрычніка 1927 г. было камуністых-сялян, выключна занятых у сельскай гаспадарцы 2.278, а сялян, якія апрача сельскае гаспадаркі заняты іншаю работаю—3.027. Камсамольцаў, якія працуюць у сельскай гаспадарцы БССР, значна больш (паводле даных ЦК ЛКСМБ на 1 кастрычніка 1927 г. было ў ЛКСМ: беднякоў — 20.317, сераднякоў—8.408). І хаця гэтыя лічбы зьяўляюцца яшчэ нязначнымі і паказваюць, што ўдзельная вага камуністых-сялян у агульнай масе сялян яшчэ вельмі невялікая, аднак, пры правільнай пастаноўцы работы з камуністымі і камсамольцамі-сялянамі, яны шмат чаго могуць зрабіць у галіне сацыялістычнае перабудовы вёскі, могуць быць праваднікамі пачынаньняў партыі ў справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

У кожным нашым вясковым раёне ў сярэднім ёсьць 30 камуністых--сельскіх гаспадароў і прыклад на ў 6—7 раз больш камсамольцаў, якія працуюць у сельскай гаспадарцы. Мы лічым, што і гэты лік зьяўляецца выстарчальнай базай для арганізацыі і разгортваньня практычнай работы вытворчых нарад камуністых і камсамольцаў-сялян з удзелам беспартыйнага сялянскага актыву для вырашэньня важнейшых пытаньняў разьвіцьця сельскае гаспадаркі.

Чым павінны займацца такія вытворчыя нарады?

Перш за ўсё гэтыя вытворчыя нарады павінны спрыяць палепшаньню, больш культурнаму вядзеньню гаспадарак саміх удзельнікаў нарад, бо ўсе матар'ялы з месц гавораць аб тым, што гаспадаркі камуністых і камсамольцаў, за рэдкім выключэньнем, мала чым адзначаюцца ад гаспадарак акружаючага сялянства, а ў некаторых выпадках, наадварот, нават адстаюць ад іх.

Палепшаньне вядзеньня гаспадарак удзельнікаў нарад можа быць дасягнута шляхам пастаноўкі на гэтых нарадах дакладаў паасобных камуністых і камсамольцаў-сялян, асабліва больш культурных гаспадароў, аб становішчы гаспадарак, аб іх недахватах і дасягненьнях, з перанясеньнем практыкі добрага вядзеньня гаспадарак па магчыма большую іх колькасьць, а таксама шляхам пастаноўкі на гэтых нарадах дакладаў аграномаў і мясцовых зямельных працаўнікоў аб практычных мерапрыемствах па паляпшэньні сельскае гаспадаркі ў даным раёне, сельсавеце, вёсцы.

Гэтыя-ж вытворчыя нарады павінны спрыяць укараненьню калектыўных элемэнтаў у сельскую гаспадарку шляхам абгаварэньня на іх практычных пытаньняў аб арганізацыі розьнага віду вытворчага кааперараваньня сялян, калектыўнае куплі сельска-гаспадарчых машын і прылад, палепшаных гатункаў скаціны, арганізацыі арцеляй, таварыстваў і калектываў. Пастановы вытворчых нарад на ўсіх такіх пытаньнях павінны насіць канкрэтны характар, прыстасоўна да ўмоў і патрэб данае мясцовасьці. Удзельнікі вытворчых нарад павінны праяўляць ініцыятыву да пастаноўкі такіх пытаньняў сярод акружаючага сялянства і сваім асабістым прыкладам узьдзейнічаць ня яго ўдзяцненьне ў розных кааперацыйных аб'яднаньні і на больш культурную пастаноўку гаспадаркі.

Шэраг іншых пытаньняў можна ставіць і вырашаць на гэтых нарадах, але і пералічаныя пытаньні складаюць выстарчальны матар'ял для разгортваньня іх работы на бліжэйшы час.

Ніўхільна ўзьнікае рад такіх пытаньняў: дзе мэтазгодна склікаць такія нарады, як часта, хто павінен запрашацца на іх, як павінны ў далейшым праводзіцца пастановы гэтых нарад і г. д.

Нам здаецца, што, як правіла, такія нарады павінны склікацца пры найбольш буйных вясковых парт'ячэйках. У першы-ж час мэтазгодна правесьці гэтыя нарады пры райкомах КП(б)Б. Але і пры скліканьні вытворчых нарад пры найбольш буйных ячэйках мэтазгодна час ад часу склікаць і раённыя вытворчыя нарады, бо ў такіх выпадках будзе больш магчымасьцяй іх абслужыць неабходнымі сіламі.

Што датычыць таго, як часта павінны склікацца вытворчыя нарады, дык нам здаецца, што агульных тэрмінаў для ўсіх месц нельга вызначыць. Апрача таго, тэрміны павінны быць рознымі для ячэек і райкомаў. Некаторыя партыйныя камітэты далі дырэктыву аб скліканьні такіх нарад ня менш аднаго разу ў тры месяцы. Гэты тэрмін можна было прыняць і для нашых райкомаў на першы час.

Апрача камуністых, якія працуюць на сваёй гаспадарцы, камсамольцаў—самастойных гаспадароў і часткі камсамольцаў, якія працуюць на гаспадарцы сваякоў, мэтазгодна запрашаць на гэтыя нарады і беспартыйны сялянскі актыў з асяродзішча сялян-дасьледчыкаў і культурных гаспадароў. На гэтых нарадах павінен абавязкова ўдзельнічаць аграном і іншыя культурна-агранамічныя працаўнікі раёну. Наогул-жа гэтыя нарады не павінны насіць характару закрытых сходаў.

Пастановы вытворчых нарад практычна павінны рэалізавацца самімі ўдзельнікамі нарад пры актыўнай дапамозе і падтрыманьні партыйных, савецкіх і іншых арганізацый вёскі. У тых выпадках, калі пастановы нарад выходзяць за межы ўказаньняў, або нарад асобным удзельнікам нарад, а носяць характар больш шырокага грамадзкага мерапрыемства, мэтазгодна іх ставіць на разгледжаньне і зацьверджаньне партарганізацый (ячэйкі, райкому), прычым удзельнікі нарад павінны быць ініцыятарамі і штыр-хачамі пастаноўкі і вырашэньня ўхваленых імі пастаноў, як сярод акружаючага сялянства, так і ў розных установах і арганізацыях.

Зразумела, па меры распаўсюджаньня гэтага віду работы неабходна будзе выпрацаваць асобнае палажэньне аб ім. Пакуль-жа ў нас практыкі яшчэ няма, парткамітэты і ячэйкі павінны асабліва ўважліва падысьці да скліканьня нарады, вывучэньня і абагуленьня першых вынікаў.

* * *

І XV зьезд УсеКП(б), і XI зьезд КП(б)Б адзначылі, як галоўны недахват у рабоце вясковых ячэек, невыстарчальнае кіраўніцтва пытаньнямі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вёскі, слабую ўвязку палітычнай работы з гаспадарчым і культурным будаўніцтвам. Адгэтуль, натуральна, неабходнасьць адшуканьня ўсякіх шляхоў да палепшаньня гэтай галіны работы. Прыклады магчымага такога палепшаньня падае нам тав. Я. Цыруль у сваім артыкуле ў апошнім нумары «Известия ЦК ВКП(б)». Ён падае ў гэтым артыкуле наступную пастанову агульнага сходу Нова-ямскай ячэйкі, Пензенскай губ.: «сьцерці з твару зямлі ў Нова-ямскай саху». І дадае, што гэту пастанову ячэйка выканала поўнасьцю, замяніўшы ў 1 з пал.—2 тыдні 197 сох плугамі. У другім месцы гэтага артыкулу т. Цыруль падае наступную вытрымку з пастановы Сібкрайкому: «Ня менш 5 цёплых хлявоў для скаціны на ячэйку ў працягу бліжэйшага году». Нам думаецца, што гэта пара прыкладаў вельмі яскрава паказваюць, як канкрэтна трэба вясковай ячэйцы падысьці да пастаноўкі і вырашэньня гаспадарчых задач і што гэтыя прыклады павінны знайсьці ўсебаковае распаўсюджаньне ў нашых умовах. Нават па зьмесьце абедзьве паданыя пастановы вельмі падыходзяць для нашых умоў. І сапраўды, пытаньне аб сасе ў нас, у БССР, зьяўляецца вельмі актуальным. Тав. Молатаў у сваім дакладзе на 15-м зьезьдзе УсеКП(б) між іншым зазначыў на адносна большае павялічэньне ў гэтым годзе ў БССР колькасьці сох у параўнаньні з колькасьцю плугоў. Усім вясковым арганізацыям КП(б)Б, як відаць, прыдзецца папрацаваць над пытаньнем аб больш шыркім выжываньні сахі з сельскае гаспадаркі БССР. Нам здаецца, што лепшым спосабам для вырашэньня такое задачы зьяўляецца такая канкрэтная пастаноўка пытаньня, як у Нова-ямскай ячэйцы. Справа, зразумела, будзе заключацца ня толькі ў вынясеньні падобнае пастановы, але і ў разгортваньні практычнае работы па рэалізацыі гэтае пастановы.

Для гэтага патрэбна будзе актыўная дзейнасьць усіх камуністых ячэйкі аж да разьмеркаваньня на кожнага камуністага ліку двароў, у якіх ён павінен будзе пабываць і «выжыць саху», а таксама актыўны ўдзел усіх грамадзкіх арганізацый. Тое самое можна сказаць і ў адносінах лёзунгу: «ня менш 5 цёплых хлявоў для скаціны на ячэйку ў працягу бліжэйшага году». І гэты лёзунг зьяўляецца зусім ужытным у нашых умовах.

Апрача пералічаных перапятых канкрэтных задач, у нас могуць быць свае, у кожным райкоме і ячэйцы асобна, у залежнасьці ад мясцовых умоў і магчымасьцяй. У адным раёне такая канкрэтная пастаноўка задач можа дакранацца пераводу пэўнае колькасьці дзесяцін на шматпольле ў працягу году, у другім—арганізацыі пэўнага характару арцеляй і таварыстваў, у трэцім—работы пракатных пунктаў і г. д.

Патрэбна толькі жывая ініцыятыва, патрэбна энэргія і настойлівасьць у правядзеньні дырэктыў партзьезду, трэба добра ведаць свой раён, сельсавет, яго патрэбы і магчымасьці. А гэта веданьне, ініцыятыва, энэргія, настойлівасьць павінны быць зараз ва ўсіх вясковых працаўнікоў.

З. Хацімскі.

Ад рэдакцыі: Зьмяшчаючы артыкул т. Хацімскага, рэдакцыя, прымаючы пад увагу важнасьць закранутых пытаньняў, просіць выказацца па гэ

ПЕРАВЫБАРЫ Ў СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Пайшчыкі ўздымаюць пытаньне аб павялічэньні паёў.

Пастанавілі павялічыць паявыя ўзносы.

БАРЫСАЎ. (Уласн. кар.). Пры вялікай актыўнасьці ўпоўнаважаных прайшлі перавыбары ў Барысаўскім прыгарадным спажывецкім таварыстве. Яшчэ задоўга да перавыбараў ішла падрыхтоўка. Таварыства абслугоўвае 130 населеных пунктаў і аб'ядноае 1.820 пайшчыкаў. Каб больш блізка пазнаёміць усю масу пайшчыкаў з працай каапэратыву, праведзен 51 сход, у тым ліку 10 сходаў жанчын і 10 беднаты.

Цікава адзначыць, што на сходах прысутнічала менш пайшчыкаў, чым мінулым пайшчыкаў (пайшчыкаў—737 чалавек, а мінулым пайшчыкаў—910). На сход упоўнаважаных зьявілася 94 проц. усяго складу.

Галоўнае балючае пытаньне, на якое была зьвернута асаблівая ўвага,—недахоп патрэбных тавараў. Барысаўскае прыгароднае таварыства аб'ядноае частку рабочых гораду і сялян. Мясцовыя кулакі ў сваіх выступленьнях на сходзе імкнуліся супрацьпаставіць пайшчыкаў гораду і вёскі. Яны крычалі, што тавар у горадзе заўсёды ёсьць, а ў вёсцы няма, прапанавалі, каб пайшчыкам з вёсак даставялялі купляць тавары ў гарадзкім рабочым каапэратыве нараўне з пайшчыкамі-рабочымі. Урэшце кулакі прапанавалі арганізаваць на сходзе «сялянскую фракцыю». Але беднякі і сераднякі далі моцны адпор кулацкай частцы. У праўленьне абрана 5 членаў, з іх 4 беднякі.

Упоўнаважаныя пастанавілі таксама перайсьці з 5-рублёвага на 10-рублёвы пай. Сход працягваўся 11 гадзін.

А. Ч.

Наказ сходу—поўнасьцю рэалізаваць фонд каапэраваньня беднаты.

МАР'ІНА ГОРКА. (Уласн. кар.). На перавыбары нашага спажывецкага таварыства з 131 упоўнаважанага зьявіліся 116. Асноўную ўвагу ўдзяліў сход справаздачы праўленьня каапэратыву за 1926-27 год. Па справаздачы праўленьня і рэўкамісіі пайшчыкі адзначылі, што каапэрацыя з кожным днём паляпшае сваю працу. Растраты зусім зьнішчаны; лік пайшчыкаў павялічыўся да 1.500 чалавек; паявы капітал вырас з 28.000 да 33.000; уласныя сродкі павялічыліся больш, чым у два разы; зварот вырас на 10 проц.; праведзена зьніжэньне цэн на 10 проц.; прыбытак за год—1.019 руб.

Слаба вялася культурная праца і каапэрацыйная прапаганда. Мала ўвагі зварочвалася на каапэраваньне беднаты—засталося нявыданых 397 руб. з фонду каапэраваньня. Раён чыннасьці таварыства не абмяжован, чаму часам ідзе канкурэнцыя з іншымі таварыствамі.

Скардзіліся пайшчыкі на тое, што наша каапэрацыя не займаецца мясным гандлем. Прыватнік за бясцэнак закупляе быдла.

Сход прызнаў працу праўленьня здавальняючай і даў наказ новаму праўленьню: у месячны тэрмін рэалізаваць поўнасьцю фонд каапэраваньня, вырашыць пытаньне наконт збыту мясных прадуктаў, рабіць па буйных вёсках справаздачы тры разы ў год, перайсьці да будучага году на 7-рублёвы пай.

У склад новага праўленьня прайшлі два старыя працаўнікі і адзін новы. На акруговы зьезд абрана 8 дэлегатаў.

Дрозд.

Лік пайшчыкаў узрос у 3 разы.

МАГІЛЕЎ. (Уласн. кар.). У сучасны момант па нашай акрузе праходзіць перавыбарчая кампанія спажывецкай каапэрацыі. Перад перавыбарамі на ўсіх раёнах і [illegible]каапэратывах праводзілася абсьледваньне дзейнасьці каапэрацыйных арганізацый.

Нядаўна ў **Прапойскім раёне** быў праведзены сход упоўнаважаных спажывецкага таварыства. Адзначана, што лік пайшчыкаў, у параўнаньні з мінулым годам, павялічыўся амаль што ў тры разы, павялічэньне таваразвароту дасягае 25.000 руб. Сярэдні пай—2 руб. 55 кап. Поўныя паі ўнесьлі мала пайшчыкаў—усяго 450 пайшчыкаў з 2.000. За справаздачны год у Прапойскім раёне адчынены дзьве новыя крамы—у вёсцы Гайшына і Дзіжанску.

Вялікія посьпехі зрабіла і **Княжыцкае** спажывецкае таварыства. За год лік пайшчыкаў павялічыўся ад 360 да 490, зварот—ад 30.000 да 43.000 руб. Загатоўкі ў мінулым годзе складалі 44.000 руб., а ў 1925-26 г.—32.000 руб. У папярэднія два гады таварыства працавала з дэфіцытам, а ў апошнім годзе яно мела каля 700 р. прыбытку.

С—ч.

Моцны адпор кулацтву.

Астрашыцкі Гарадок. (Уласн. кар.). Скончылася перавыбарная кампанія на раёне. На перавыбарчыя сходы Беларуцкага спажывецкага таварыства, якое ахапляе тры сельсаветы, зьявілася 77 проц. пайшчыкаў. Увага была завострана на пытаньні аб растратах (за справаздачны пэрыяд у каапэратыве было растрачана 800 руб.). З дасягненьняў адзначылі добрую працу па каапэраваньні беднаты. (Каапэравана 95 проц. беднаты з 3 руб. паем у сярэднім). Палепшан асартымэнт тавараў. На адным з сходаў выступіў кулак, які казаў: «Дачакаецеся вы ад каапэрацыі танных тавараў! Вось калі я прадам капя, ды карову, адчыню краму, тады будзе ў мяне танны тавар». Яго прамова выклікала абурэньне ўсяго сходу, адусюль паляцелі прапановы: «Выкінуць яго з пайшчыкаў; знаем мы, як спекулянты дзяруць, калі якога-небудзь тавару ў каапэрацыі няма».

Абрана 119 упоўнаважаных, з якіх 52 проц. беднякоў і 40 проц. сераднякоў.

Вельмі ажыўлена прайшлі перавыбары **Астрашыцка-Гарадзецкага** спажывецкага таварыства. За справаздачны пэрыяд таварыства адкрыла буфэт, абсталявала новую хлебапякарню, значна павялічыла таваразварот (больш 100.000).

Не абышлося без дэмагагічных выступленьняў заможнага элемэнту. Адзін прапанаваў абіраць членаў праўленьня без рэкамэндацыі партыйнай фракцыі, другі знайшоў неабходным абіраць такіх таварышоў, у якіх можна было-б у выпадку растраты спагнаць маемасьць. Сьмех і шум не далі ім магчымасьці скончыць прамовы.

П.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ ПА НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Узмоцненая дзейнасьць прыватніка на сырцовым рынку.

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта).

За апошнія часы становішча на скураным рынку ў Аршанскай акрузе зьмянілася ў бок пагоршаньня. Асноўнай прычынай зьяўляецца ўзмоцненая дзейнасьць прыватніка-саматужніка.

Наглядаецца імкненьне былых гаспадароў гарбарань арганізоўвацца ў таварыствы, каб гэтым самым утаіць свае прыбыткі ад фінансавых органаў і карыстацца прывілеямі саматужнікаў.

Тэкія арцелі арганізаваліся ўжо ў Талачыне, Дубраўны, Горках і Мсьціслаўлі. Гэтыя арцелі закупаюць скураны сырэц на мясцовым рынку і плацяць на 100—125 проц. вышэй лімітных цэн. Зразумела, што пры такім становішчы сырэц, які прапануецца на раённых кірмашох, на 70-80 проц. пераходзіць да прыватніка. Другой прычынай пагоршаньня становішча зьяўляецца тайны забой жывёлы.

Каб абсьледваць стэновішча скуранога рынку па акрузе і ажыцьцёвіць шэраг рэгулюючых мерапрыемстваў, была выдзелена спэцыяльная камісія. Гэтая камісія абсьледвала рад раёнаў і выявіла шмат ненармальнасьцяй у ходзе загатовак скуранога сырцу. Устаноўлены ў некаторых раёнах наступныя факты. Пры існаваньні абавязковай засолкі скур з аплатай у 1 руб. 20 кап. за кілё, больш 50 проц. буйнога скуранога сырцу і 80% дробнага ідзе з бойні на прыватны рынак. Устаноўлена таксама, што ў Коханавіцкім раёне, пры існаваньні абавязковай засолкі па Аршанскай акрузе ўжо больш двух год, засолка пачала вытвварацца толькі з 20 кастрычніка 1927 г. і то з аплатай замест 1 р. 20 к. у 17 кап. Зразумела, што пры гэткім становішчы ўвесь сырэц з гэтай бойні па ўсе 100 проц. ідзе да прыватніка.

Выявілася, што па Талачынскім раёне пры непасрэдным сядзейнічаньні раённага ветэрынарнага доктара адбываецца тайны забой скаціны з пасьлядовым продажам скур на прыватным рынку. Камісія палажыла гэтаму канец і вінаватыя адданы пад суд.

Плянавыя загатоўкі скуранога сырцу па Аршанскай акрузе сёлета праходзяць з недавыкананьнем: па капіне і вырастку—на 70-80 проц., а па іншых відах скуранога сырцу—на 10-15 проц.

Зараз з боку рэгулюючых арганізацый як вышэйшых, так і мясцовых, прымаецца шэраг мерапрыемстваў для аздараўленьня становішча рынку.

Дыспансэр для дзяцей.

ВОРША. (Уласн. кар.). 10 студзеня адкрыўся дзіцячы дыспансэр, які будзе абслугоўваць дзяцей дашкольнага ўзросту

Дыспансэр мае на мэце выявіць здароўе кожнага аглядаемага і папярэдзіць захворваньні.

Пры дыспансэры будуць працаваць габінэты: па хваробе вачэй, тэрапэўтычны, зубны і інш.

Змаганьне з бяспрытульнасьцю.

ВОРША. (Уласн. кар.). З 1.000 бяспрытульных дзяцей, якія ёсьць на акрузе, за год акрдэсткамісіяй накіравана ў дзіцячыя дамы акругі 140 чал., у беларускую калёнію—15, у Гжацкі дзіцячы прыемнік—8 і ў інстытут сацыяльнага перавыхаваньня—6. Адшукана бацькоў і накіравана дамоў 94 чал., перадана на патранат у сялянскія сем'і 119 чал.

Адусюль.

— У вёсцы Рэкця, Журавіцкага раёну (Магілёўшчына), пачалася эпідэмія сыпнога тыфусу. Зарэгістравана 36 хворых.

— Бабруйскі акруговы белсельбанк адпускае 20.000 руб. крэдыту на пабудову ў вёсцы масаробчых і сыраваральных заводаў.

— У Бабруйску абсталёўваецца хуткім тэмпам „Дом абароны". Адчыненьне дому адбудзецца ў дзень гадавіны Чырвонае арміі.

— Зараз на Бабруйшчыне налічваецца 253 конапешых паштовых вучасткаў, 27 кальцавых трактаў. Поштай ахоплена 93 процанты вясковага насельніцтва.

Рабочыя масы у барацьбе за рацыяналізацыю.

Што паказала абсьледваньне вытворчых нарад?

(Віцебск.)

Вынікі абсьледваньня працы вытворчых камісій і нарад па 6-мі буйнейшых прадпрыемствах Віцебшчыны (фабрыка «Дзьвіна», завод «Чырвоны мэталісты», броварны і дражджавы заводы, акулярная фабрыка, камунальны трэст) гаворыць аб значным зруху ў гэтай галіне. Больш дакладна робіцца падрыхтоўка і падбор пытаньняў для нарад, большасьць прапаноў вытворчых нарад праводзіцца адміністрацыяй у жыцьцё. На заводзе «Чырвоны мэталісты» з 108 прапаноў 98 праведзена ў жыцьцё, Такое-ж становішча [illegible] і па іншых прадпрыемствах, за выключэньнем Белазяржбуду.

У вытворчыя нарады ўцягваюцца ўсё новыя і новыя слаі рабочых. Але гэта яшчэ повыстарчальна. На фабрыцы «Дзьвіна» за 9 месяцаў у трох цэхавых нарадах бралі ўдзел толькі 350 чалавек. На заводзе Мэтпраму, які налічвае 926 чалавек, праведзена 10 цэхавых нарад і дзьве агульна-заводзкія, у якіх бралі ўдзел всяго толькі 140-145 чалавек. На акулярнай фабрыцы за 8 месяцаў былі тры нарады в сярэднім лікам удзельнікаў 35-99 чалавек. Гэтыя лічбы гаворыць аб тым, што як колькасьць нарад, так і лік уцягнутых у іх рабочых усё яшчэ невыстарчальны.

Асабліва трэба адзначыць слабы ўдзел у нарадах вышэйшага тэхнічнага пэрсаналу і адміністрацыі.

Адным з важных недахопаў у працы вытворчых нарад зьяўляецца слабое плянавае кіраўніцтва нарадамі з боку партыйных і прафэсыйных арганізацый.

Ня ўсюды добра абстаіць справа з дапамогай выканаходцам. На фаб[illegible] удасканаленьняў—варштат для праверкі. Абодвы яны прэм'яваны. А вось на акулярнай фабрыцы рабочы, які ўдасканаліў працу штампу, не прэм'яваны. Гэта наглядаецца і ў камунальным трэсьце. РСІ, якая вывучала вынікі абсьледваньняў, дала рад прапаноў, якія накіраваны на далейшае паляпшэньне працы вытворчых нарад.

Г.

Зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

(Лесазаводы, Мазыр).

Нядаўна мазырскае акруговае праўленьне саюзу дрэваапрацоўшчыкаў заслухала даклад дырэктара мазырскага аддзяленьня Лесбелу аб выніках складаньня балянсу за 1926-27 гаспадарчы год.

Дырэктар аддзяленьня ў сваім паведамленьні адзначыў, што сабекошт фанэры на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» зьніжан на 3,3 проц., сабекошт лесапільнай прадукцыі на заводзе «Пралетары»—на 18 проц., на заводзе «Зьвязда»—на 5,69 проц. Гэта зьніжэньне было дасягнута дзякуючы бесперабойнаму забесьпячэньню заводаў сырцом, [illegible] прадукцыйнасьці працы [illegible] агульна-заводзкіх выдаткаў.

Адначасова адзначана, што па бачарнай вытворчасьці было некаторае павялічэньне сабекошту (ад 2,1 проц. да 2,37 проц. па наасобных заводах), што тлумачыцца значнымі перапынкамі ў рабоце гэтых заводаў (у сярэднім—2—4 месяцы ў годзе) і невыстарчальным скарыстаньнем кваліфікаванай рабочай сілы. Таксама наглядалася некаторае павялічэньне сабекошту фанэры на заводзе «Зьвязда» (на 2 проц.).

Праўленьне саюзу, у мэтах далейшага зьніжэньня сабекошту прадукцыі, дало рад дырэктыў аб мэханізацыі больш значных дапаможных работ, разьвіцьці новых відаў пераапрацоўкі прадукцыі, пераводзе наасобных вытворчасьцяй на 2—3 зьмены. Асаблівая ўвага была зьвернута на працу вытворчых нарад, якія павінны заняцца сталай прапрацоўкай пытаньняў патаненьня прадукцыі і правільнага скарыстаньня сырцу, адкідаў і г. д.

Б. Ш.

СЭСІЯ ЦВК БССР.

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ ТАВ. БАЛІЦКАГА.

Што на чым будаваць?

Тав. Некрашэвіч спыняецца на тэй надбудоўцы, якая павінна быць зроблена над прафшколай.—Наркамасьветы,—гаворыць ён,—прапануе гэтую надбудову рабіць не над прафшколаю, а часткова над сямігодкаю. Прымаючы пад увагу, што і тэхнікум, і прафшколы будуюцца на сямігодцы, трэба адзначыць, што розьніца толькі ў адным годзе навучаньня, а між тым правы тэй і другой навучальнай установы розныя. Хто канчае прафшколу, атрымлівае кваліфікацыю рабочага, а хто канчае тэхнікум—кваліфікацыю тэхніка. Больш рацыянальна робіць Украіна, калі будуе тэхнікум над сямігодкаю. Над сямігодкаю павінны будавацца і ВНУ.

Разрыў паміж сярэдняй і вышэйшай школай.

Тав. Вальфсон. БССР патрэбна самая тапная, адпавядаючая запатрабаваньням не эканоміцы і сыстэмы, найбольш гібкая і рэальная сыстэма народнае асьветы.

На падставе вопыту ў мяне складалася такое ўражаньне, што ў нас у сыстэме ня ўсё добра. У нас існуе сур'ёзны разрыў паміж сярэдняй і вышэйшай школай. Напрыклад, аб двухгадовым практычным стажы—гэта надзвычайна памылковая пастаноўка пытаньня. У той момант, калі падростак мае найбольшую магчымасьць займацца, калі ён найлепшым чынам трымае кнігу ў руках, калі ён зьяўлуецца найбольш здольным, мы яго пасылаем на вытворчасьць, якая ня мае ніякіх адносін да яго будучай спэцыяльнасьці. Атрымліваецца адно з двух: або ён стане добрым мэталістым і тады па мэдыцынскі факультэт ня пойдзе. А хто-ж ведае, можа ён быў-бы добрым доктарам? Ці, напрыклад, падростак пойдзе на вытворчасьць, абрасьце сям'ёй, яму стане цяжка трымаць кнігу ў руках і тады ён зьгіне для вышэйшай асьветы. А калі ён акажацца дрэнным мэталістым, то ён будзе лаяць і самога сябе, і вытворчасьць, на якой находзіўся два гады, і ў вышэйшую навучальную ўстанову ўжо вярнуцца ня зможа. Такі пункт не адпавядае інтарэсам разгортваньня народнае асьветы.

Увага батраком.

Тав. Даўгаланьцьева. Трэба ўдзяліць больш увагі самай адсталай частцы нашага насельніцтва—батраком. У нас, на Беларусі, ёсьць яшчэ раз вёсак, дзе ня толькі няма хаты-чытальні, але [illegible] і школы. Члены ЦВК, калі яны вернуцца да хаты, павінны склікаць сходы ня ў вёсцы, а ў раёне, каб растлумачыць усяму насельніцтву настаноўку справы аб народнай асьвеце і каб пры гэтым не забываць нашых батракоў.

На больш высокі тэхнічны ўзровень.

Тав. Лаціс. Мы павінны будаваць нашу народную асьвету ў тым напрамку, каб даць нашай прамысловасьці больш кваліфікаваных працаўнікоў, якія-б забясьпечылі далейшы пераход на больш высокі тэхнічны ўзровень. Неабходна таксама ўзьняць культурны ўзровень шырокіх мас працоўных дзеля таго, каб можна было перайсьці на больш высокі тэхнічны ўзровень у нашай сельскай гаспадарцы.

Патрэбна ўвязка сыстэмы.

Тав. Платун. Сыстэмы народнае асьветы ня толькі ў нас, на Беларусі, але па ўсім Саюзе ня маюць паміж сабою ўвязкі, і гэта галоўны недахоп, які мы зараз адчуваем у нашай народнай асьвеце. Бываюць такія выпадкі, калі вучань, скончыўшы тую ці іншую навучальную ўстанову на Беларусі і маючы жаданьне паступіць у ВНУ іншых саюзных рэспублік, пазбаўлены магчымасьці гэта зрабіць. І таму неабходна прыстасаваць сыстэмы ўсіх рэспублік да таго, каб была ўвязка і каб вучань з адной рэспублікі мог перайсьці ў ВНУ іншых рэспублік.

Голас навуковых працаў нікоў.

Тав. Козыраў. Гэтае пытаньне будзе перадана на абгаварэньне шырокіх мас рабочых і сялян і ў прыватнасьці нашай інтэлігэнцыі, бо нашы навуковыя працаўнікі таксама зацікаўлены ў вырашэньні гэтага пытаньня і ў правільнай яго пастаноўцы. Мы, навуковыя працаўнікі, вельмі зацікаўлены ў тым, каб сыстэма народнае асьветы была пабудавана так, каб яна давала лепш падрыхтаваных студэнтаў, якія ў далейшым будуць вучыцца ў нашай сельска-гаспадарчай акадэміі, з асяродзішча якіх мы будзем падрыхтоўваць спэцыялістых, так неабходных нашай прамысловасьці і нашай сельскай гаспадарцы.

Сыстэма адпавядае патрабаваньням будаўніцтва.

Тав. Жылуновіч. Гэтая сыстэма, аб якой мы сёньня гаворым, у значнай меры адпавядае тым патрэбам нашага гаспадарчага будаўніцтва і тым умовам, якія маюцца ў нас, у Савецкай Беларусі.

Само сабой зразумела, што гэтая сыстэма яшчэ ня мае ўдасканаленага ўгрунтаваньня. Да гэтага часу, наколькі нам відома, у Савецкім Саюзе маюцца тры асобных сыстэмы народнай асьветы, якія адна да другой не падобны, і ўсё-такі нельга сказаць, каб хоць адна з іх мела найвыдатнейшую і самую ўдасканаленую форму ў адпаведнасьці да жыцьця. У далейшым тав. Жылуновіч падкрэсьлівае тыя недахопы, якія, па яго думцы, маюцца ў сыстэме народнае асьветы, вынесенай на абгаварэньне сэсіі.

Сыстэма і эканамічны базіс.

Тав. Іванова. Зусім зразумела, што сыстэма народнае асьветы павінна ўпірацца ў эканамічны базіс. Калі гэтага няма, дык сыстэма бязумоўна лопне, як старая вопратка на моцным целе і спаўзе за непатрэбнасьцю. Калі прыглядзімся з вамі да існуючых трох сыстэм народнае асьветы—РСФСР, Украіны і БССР, то мы, перш на-перш, убачым, што гэтыя тры сыстэмы ў значнай меры адпавядаюць запатрабаваньням сёньнешняга дня. У асноўным гэтыя сыстэмы маюць устаноўку на прафэсыянальную адукацыю. Праўда, як сказаў тав. Жылуновіч, паміж гэтымі сыстэмамі маецца некаторая розьніца. Наша задача заключаецца ў тым, каб гэтую розьніцу зьвесьці да мінімуму і па магчымасьці дайсьці да агульнай сыстэмы па Савецкім Саюзе.

Ці адбівае сыстэма інтарэсы сялянства?

Тав. Шамардзіна. Пастаноўка пытаньня аб сыстэме народнае асьветы на Беларусі тут па сэсіі гаворыць аб тэй вялікай увазе, якую выказваў урад БССР да культурнага будаўніцтва нашай краіны. Зразумела, што пытаньне народнае асьветы ў нашай краіне мае надзвычайна вялікае значэньне, калі гаворым аб тэй культурна-рэвалюцыйнай эпосе, якая надыходзіць і стукаецца нам у дзьверы. Наркамасьветы БССР зусім правільна зрабіў, што, працуючы над сыстэмай народнае асьветы, зьвязаў гэтае пытаньне з нашым гаспадарчым разьвіцьцём і тымі гаспадарчымі плянамі, якія стаяць на чарзе перад урадам БССР. Але тая схэма, якую нам тут прадставіў тав. Баліцкі, вельмі зграбная, вельмі прыгожая па выгляд зьяўляецца вельмі сухой і невыстарчальна гібкай, асабліва ў параўнаньні з тэй схэмаю, якую мы бачым на Украіне. Украінская сыстэма больш адпавядае жыцьцю. Нажаль мы тут на сэсіі ня чулі таварышоў, якія непасрэдна ведаюць, чаго патрабуе наша сялянства і наша дробная прамысловасьць. Гэтага адбітку інтарэсаў шырокіх колаў сялянства і нашай дробнай прамысловасьці я ў гэтым праекце сыстэмы ня бачу.

Няма ўвязкі асобных частак.

Тав. Гельтман. Усе складаныя часткі сыстэмы павінны быць паміж сабою ўзгоднены, але гэта ня значыць, што ўся сыстэма павінна весьці да аднаго, а іменна—да таго, каб падрыхтаваць да вышэйшай школы. А вось гэтая ўстаноўка на вышэйшую школу па-мойму адчуваецца ў гэтай сыстэме. Адносна гібкасьці цалкам згаджаюся з прафэсарам Вальфсонам, што гібкасьць павінна заключацца ў тым, каб даваць магчымасьць вучню выбіраць той тып школы і тую прафэсыю, якія яму найбольш адпавядаюць. Паміж трыма часткамі сыстэмы няма выстарчальнай увязкі і таму тут цяжка гаварыць аб адной адзінай сыстэме.

КАРКЛІН.

Пытаньні народнае гаспадаркі БССР.

Пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР павінен поўнасьцю адбіваць інтарэсы разьвіцьця народнае гаспадаркі нашае краіны, але, адначасова, плян гэты павінен быць адпаведным парадкам увязаны з агульным разьвіцьцём гаспадаркі ўсяго Савецкага Саюзу. Гэта галоўнае, што мы павінны ўлічваць у нашай рабоце. У «Правде» і радзе іншых газэт нядаўна былі агалошаны вынікі абгаварэньня нашага дакладу ў Дзяржплане СССР. Вось што ў асноўным было прычнята Саюзным Дзяржплянам:

«а) Прызнаць, што прадстаўленыя Дзяржплянам БССР матар'ялы да пяцігадовага пэрспэктыўнага пляну народнае гаспадаркі БССР на пяцігодзьдзе 1927-28—1931-32 г. г. зьяўляюцца вынікам вялікай і сур'ёзнай работы, якая ў асноўных лініях супадае з вызначэньнямі Дзяржпляну Саюзу.

б) Бяручы пад увагу эканамічныя і фінансавыя магчымасьці БССР у працягу бліжэйшага пяцігодзьдзя, лічыць, што колькасныя выражэньні пэрспэктыўнае арыентыроўкі Дзяржпляну БССР уяўляюць сабою намячэньні аптымальнага варыянту пляну...»

Што значыць аптымальны варыянт? Гэта значыць, што ён вялікі па зьмесьце, хоць і добра складзен. Значыцца, трэба скласьці і другі такі самы плян, але меншы на зьмесьце. Адгэтуль вынікае сур'ёзная задача на будучы час. Яна патрабуе грунтоўнай работы ў радзе важнейшых галін нашае народнае гаспадаркі. Прыдзецца значна ўзмацніць інтэнсіфікацыю нашае сельскае гаспадаркі, палепшыць мэліярацыйныя работы, яшчэ раз праверыць перасяленчую залёку, узмацніць меры па барацьбе з беспрацоўем, пашырыць паасобныя галіны прамысловасьці, забясьпечыць пытаньні арганізацыі працы. Усе гэтыя пытаньні стаяць перад намі ва ўсёй сваёй вострасьці.

Але ёсьць і яшчэ адно вельмі важнае пытаньне—**аб выкарыстаньні ня толькі дзяржаўных сродкаў, але і сродкаў накапленьня самога насельніцтва.**

На цяперашняй сэсіі ЦВК, сяляне—члены ЦВК—адзін ачалі прыкметны рост сельскае гаспадаркі, накапленьне ў ёй. Іх заўвагі зусім правільныя. Накапленьні ў сельскай гаспадарцы ёсьць і зараз стаіць пытаньне аб тым, як гэтыя накапленьні выкарыстаць.

У газэце «Экономическая Жизнь» № 3, у артыкуле «Кан'юнктура народнае гаспадаркі», даецца наступная ацэнка накапленьняў у сельскай гаспадарцы:

«Паводле падліку дзяржаўных загатовак і пляцяжоў, мы маем у лістападзе рост пакупное здольнасьці вёскі на 15 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Па лініі іншых паступленьняў у вёску (ад па-за плянавых і прыватных загатовак і ад ня сельска-гаспадарчых заработкаў) гэты процант, паводле агульна-дзяржаўных і рынкавых абставін, павінен быць падвышан. З другога боку, паводле даных прыбыткова-выдатковых запісаў, грашовыя рэшткі ў сялянскай гаспадарцы за апошнія месяцы падвышаюцца: у жніўні плюс 16 проц., у верасьні — плюс 14 проц. У кастрычніку і лістападзе, паводле даных раённых кан'юнктурных бюро, мела месца далейшае накапленьне вёскаю грашовых сродкаў».

Агульнасаюзная ацэнка, такім чынам, адпавядае ацэнцы, якую даюць сяляне-члены ЦВК БССР.

Рад неабвяржымых даных яскрава і пераканальна пацьвярджаюць гэта.

Мы маем ня дрэнны ўраджай. У гэтым годзе праводзіліся вялікія гаспадарчыя работы на шляхох і чыгунках, дзякуючы чаму сяляне, якія былі заняты на гэтых работах, зарабілі каля 4—5 мільёнаў руб. Лесараспрацоўкі таксама далі ўжо каля 4 мільёнаў руб. Крэдыты сялянству ў параўнаньні з мінулым годам ня зьменшаны, ільготы таксама ня зьменшаны, а наадварот, павялічаны — гэта ўсім вядома. Значыць агульны малюнак у сэнсе прыбытковасьці сялянскіх гаспадарак спрыяючы.

Але, калі мы наглядзім, як выконваюцца абавязацельствы да дзяржавы, дык мы ўбачым, што тут справа стаіць ня зусім добра.

Возьмем адзіны сельска-гаспадарчы падатак. У нас ёсьць раёны, якія на ўсе 100 проц. выканалі падатак і нават стараюцца ўжо ўнесьці падатак за позьнія тэрміны. Але ёсьць і такія раёны, дзе яшчэ ня выкананы першы тэрмін, ня гледзячы на тое, што ён даўно мінуў і што падатак не асабліва вялікі.

Далей ідзе сур'ёзнае пытаньне, на якое трэба зьвярнуць увагу—аб завінавачанасьці сялянства дзяржаўнаму страхаваньню. **Больш чым 30 проц. завінавачанасьці па дзяржаўным страхаваньні не пакрыта.**

Ёсьць таксама вялікая завінавачанасьць і па сельска-гаспадарчым крэдыце.

Возьмем другое пытаньне—**хлебазагатоўкі.** У БССР хлеб завозіўся, будзе завозіцца і надалей. Аднак, зараз мы перажываем рад затрудненьняў у агульна-саюзных загатоўках. Вось што піша «Экономическая Жизнь» па гэтым пытаньні:

«Заможныя пласты вёскі, якія выступілі ў якасьці прадаўцоў на хлебным рынку, у пачатку кампаніі (відавочна з мэтаю замены старога зярна новым) праяўляюць стрыманасьць у збыце збожжа, а часамі нават самі скупляюць яго.

У зьвязку з памянёнымі фактарамі кошт плянавых загатовак упяршыню з пачатку сельска-гаспадарчага году зьяўляецца ў лістападзе ніжэйшы, чым летась. Гэта зьніжэньне прыпадае амаль цалком на хлеб...» (№ 3 ад 4/1—28 г.).

А мы паставілі перад сабою задачу завезьці ў БССР 15—19 млн. пуд. хлеба на гэты гаспадарчы год. Зразумела, калі справа хлебазагатовак ідзе туга ў саюзным маштабе, дык мы ня можам разьлічваць, што мы поўнасьцю ажыцьцёвім плян завозу. Праўда, у БССР завезьлі ўжо 8 мільён. пуд., але наўрад ці можна разьлічваць на завоз хлеба на ўсю намечаную суму. **Абавязкова трэба выканаць задачу ўнутраных загатовак хлеба для забесьпячэньня сялянскай беднаты, ільнаводчых раёнаў і рабочых цэнтраў.** Мы намецілі загатовіць ўнутры БССР прыблізна каля 2 мільён. пудоў, каб праз каапэрацыю мець магчымасьць забясьпечыць пераліченыя групы насельніцтва.

Ёсьць і другі момант. Вось «Правда» два дні таму назад пісала, што ня толькі кулак перашкаджае загатоўцы хлеба, але і паша непаваротлівасьць.

«Цяпер ужо ня можа быць сумненьня ў тым, што ў прыпыненым проці 1926-27 г. ходзе хлебазагатова апошніх месяцаў вельмі значная доля віны прыпадае на інэртнасьць нашага гаспадарчага (гандлёвага, фінансавага, прамысловага) апарату». («Правда» № 5, ад 6 студзеня 1928 г.)

Такім чынам, мы бачым, што і з нашага боку ёсьць недахваты; такія арганізацыі, як каапэрацыя (усіх відаў) і дзяржаўны гандаль, не змаглі досыць гібка маноўраваць, як гэтага патрабавалі інтарэсы ўсёй краіны; адсутнічала і неабходная ўвязка ў рабоце паасобных загатоўцаў. **Ва ўсёй справе хлебных і сырцовых загатовак трэба стварыць рашучы пералом у бок сапраўднага і найбольш поўнага выкананьня намечанага пляну.**

Яшчэ адна вельмі важная задача, гэта—**каапэраваньне бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак;** адгэтуль—прыцягненьне паявых узносаў, узмацненьне каапэрацыйнага звароту, упягненьне праз каапэрацыйны зварот сялянскага сырцу.

Мы ўсе ведаем, што нашы шляхі вельмі дрэнныя і па рамонт іх патрэбны сродкі. Мы на дзяржаўным бюджэце выдаем на гэтую справу **больш аднаго мільёну руб.,** але гэта сума, зразумела, невыстарчальна, бо яна можа быць толькі штырхачом для таго, каб зрушыць шляхавую справу. Рэшту патрэбных грошай трэба адшукаць праз самаабкладаньне сялянства, а між тым закон аб самаабкладаньні неяк вяла і слаба праводзіцца ў жыцьцё.

Наша гаспадарка разьвіваецца, сырцавы рынак пашыраецца, а пераваезьці гэты сырэц па нашых шляхох не магчыма. Недарма-ж у нас існуюць неапэктоды, а факты аб тым, што гусі плаваюць у самым сяле, да сяла даедзеш, а праз сяло не праедзеш. Калі само сялянства возьмецца за рамонт гэтых шляхоў, дык яно тым самым вызваліць дзяржаўныя сродкі, якія можна будзе кінуць на іншыя патрэбы і гэтым самым дапамагчы больш поўнаму ажыцьцяўленьню нашага пяцігадовага пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі. **Закон аб самаабкладаньні павінен быць з усёй сур'ёзнасьцю спаткан і праведзен у жыцьцё.**

Мы ведаем, што разьвіцьцё нашае сельскае гаспадаркі магчыма толькі тады, калі мы ўзьнімем наша, прамысловае будаўніцтва, бо прадукцыя прамысловасьці стварае пашырэньне попыту на сельска-гаспадарчыя тавары, а значыцца праз яе мы стараем стымул уваемнага будаўніцтва і сельскае гаспадаркі і прамысловасьці. Мы ведаем, што рабочая кляса БССР, жадаючы ўзьняць прамысловае буданіцтва на вышэйшую ступень, рэалізавала вышэйшую пазыку індустрыялізацыі; мы па Беларусі атрымалі заданьне рэалізаваць каля 2 мільёнаў руб., а **рэалізавалі на 2.300 тысяч руб.** Гэтым самым рабочыя і служачыя паказалі сваю сьвядомасьць і актыўнасьць у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Цяпер мы стаім перад выпускам другой пазыкі—**сельска-гаспадарчай пазыкі**—для ўздыму, палепшэньня і узмацненьня сельскае гаспадаркі.

Наша гаспадарчае становішча патрабуе поўнай рэалізацыі гэтай новай пазыкі. Калі пазыка індустрыялізацыі была рэалізавана на суму 2.300 тыс. руб., дык аблігацыі пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі павінны быць рэалізаваны на ня меншую суму. **Да гэтай задачы нам трэба энэргічна падрыхтавацца.**

Пры правядзеньні ўсіх гэтых мерапрыемстваў, пры правільным выкарыстаньні ўнутранога накапленьня, наш пяцігадовы плян ня толькі ня будзе ўрэзан і зпужан, а павінен быць яшчэ пашыраны.

БССР на міжнародных кірмашох.

Сёлета адбудзецца рад міжнародных кірмашоў, у якіх прыме ўдзел СССР: у сакавіку—у Лейпцыгу, у красавіку—у Мілане і ў Брусэлі і ў маі—у Парыжы.

Аркамгандаль БССР пачаў падрыхтоўчую працу да ўдзелу БССР у гэтых кірмашох.

На кірмашох будуць прадстаўлены наступныя групы тавараў: лес, лекавыя расьліны, харчовыя прадукты, саматужныя вырабы, вытворчасьць друку і сельска-гаспадарчы сырэц.

Наркамгандаль БССР мяркуе прыцягнуць да ўдзелу ў гэтых кірмашох - выстаўках: Белдзяржгандаль, Белсельсаюз, Белкаапсаюз, ВСНГБ, Лесбел, Белдзяржкіно, Белдзяржвыдавецтва і інш.

МЕНСК

ШКОЛЬНЫЯ НАВІНЫ.

Канфэрэнцыя яўрэйскіх настаўнікаў.

У Менску 12 гэтага студзеня адкрываецца акруговая канфэрэнцыя яўрэйскіх настаўнікаў. Першым будзе заслуханы даклад сакратара Менакругкому тав. Акуліка аб задачах культурнага будаўніцтва, потым справаздача акруговага інспэктарыяту і Капыльскае сямігодкі.

У часе канфэрэнцыі будуць працаваць паасобныя сэкцыі па пытаньні аб рабоце вячэрніх школ у мястэчках.

У канфэрэнцыі возьме ўдзел усё яўрэйскае настаўніцтва Менску і 70 дэлегатаў ад раёнаў.

Канфэрэнцыя будзе адбывацца ў камвузе і працягнецца каля 4-х дзён.

Ненаведваньне школ.

Паводле дэмаграфічнага перапису камісія па ўсеагульным навучаньні выявіла, што ў Менску ў бягучым навучальным годзе ёсьць 113 васьмігадовых дзяцей, якія не наведваюць школы.

Камісія пастанавіла вывучыць пытань не, чаму гэтыя дзеці застаюцца па-за школаю.

На школьнае будаўніцтва.

Паводле пляну ўсеагульнага навучаньня ў Меншчыне ў 1927-28 годзе трэба будаваць 109 камплектаў на агульную суму 327.000 руб. Пункты пабудовы школ прыблізна намечаны, але канчатковае вырашэньне гэтага пытаньня будзе залежыць ад таго, наколькі сялянне тэй ці іншай мясцовасьці заявяць аб сваім жаданьні пайсьці на дапамогу ў справе пабудовы.

На падтрыманьне ініцыятывы сялянства ў справе школьнага будаўніцтва мяркуецца адпусьціць 31.880 р.

З усяе сумы ў 327 тысяч руб., на новае будаўніцтва ідзе 230 тысяч руб. і на дабудову няскончаных школ 65.120 руб.

Адпушчаныя сумы складаюцца з 80 тысяч руб., праведзеных па акруговым каштарысе, а рэшта будзе адпушчана з субвэнцыі і па маніфэсту.

Пленум акрвыканкому разьмеркаваньне гэтых сродкаў вышэйпамянёным спосабам зацьвердзіў.

Мільён—на пабудову унівэрсытэцкага гарадка.

БДУ вядзе перагаворы з Белдзяржстроем на здачу яму работ па пабудове ў Менску унівэрсытэцкага гарадка.

У Маскву, у Саюзны Дзяржплян і Наркамфін прадстаўлены каштарыс на будаўнічыя работы на агульную суму ў 6.400.000 руб. У сакавіку каштарыс будзе разглядацца і вызначаны парадак фінансаваньня.

Паводле атрыманых у Менску вестак, сьпярша адпушчаны 1.000.000 р. на выкананьне работ. Праект унівэрсытэцкага гарадка ў асноўным Дзяржплянам Беларусі зацьверджаны.

У красавіку будзе прыступлена да пабудовы трох карпусоў—галоўнага, хэмічнага і анатамічнага. Кошт гэтых трох карпусоў складае 2.500.000 руб. У гэтым годзе мяркуецца выканаць 50 пр ц. праграмы па пабудове гэтых карпусоў з такім разьлікам, каб у будучым годзе закончыць унутраныя работы. У гэтым-жа годзе мяркуецца залажыць сыстэму цэнтральнага ацапленьня ўсяго унівэрсытэцкага гарадка.

Аб адміністрацыйным высяленьні з дамоў.

Пры Менскай акруговай пракуратуры адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў камгасу, праўленьняў ЖАКТ'аў і органаў міліцыі.

Нарада была склікана з мэтаю вырашэньня труднасьцяй пры правядзеньні ў жыцьцё закону ад 19-га лютага мінулага году аб адміністрацыйных высяленьнях з кватэр.

На практыцы сустракаюцца выпадкі масавага самаўпраўства асобных грамадзян і захопу кватэрнае плошчы, якая належыць як камгасу, так і ЖАКТ'ам. Былі выпадкі няправільнага вычоту 30 проц. нормы з боку Менскага камгасу і адсюль незаконнае ўсяленьне кватарантаў наперакор закону аб уплатненьні.

Прадстаўнікі камгасу адзначылі рад самаўпраўстваў з боку вайсковага ведамства і асобных вайсковых працаўнікоў.

Нарада канстатавала слабасьць вычоту камгасам кватэрнае плошчы. Вылучана камісія з 7 чалавек пад старшынствам намесьніка акруговага пракурора тав. Лабіновіча, якой даручана выпрацаваць мераприемствы па зьнішчэньні дэфэктаў пры ўжываньні закону аб адміністрацыйным высяленьні.

Наступную нараду па гэтым пытаньні пастаноўлена склікаць да 10-га лютага.

Да пабудовы новага цэлюлёднага заводу.

Гэтымі днямі праектна-тэхнічнае бюро ВСНГБ закончыла абсьледваньне вучастку зямлі для пабудовы новага цэлюлёднага заводу Белпапертрэсту. Вучастак намечан у гор. Бабруйску на Бярэзінскім фарштаце, на высокім беразе р. Бярэзіны. Вучастак выгадна разьмяркаваны ў адносінах сувязі з чыгункаю і воднымі шляхамі. Праект заводу распрацоўваецца ў Маскве.

За дзень.

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ З САЮЗУ РАСТРАТЧЫКАЎ. ЦП саюзу хомікаў зацьвердзіў пастанову агульнага сходу гуты „Пралетары" аб выключэньні з саюзу двух зборшчыкаў членскіх узносаў—Бізюка і Ханскага, якія растрацілі 107 руб.

НОВЫ ДОМ ДЛЯ РАБОЧЫХ. На ст. Негарэлае закончана пабудова новага дому на чатыры кватэры для рабочых чыгуначнікаў.

ПЕРАВЫБАРЫ ФАБРЫЧНЫХ КАМІТЭТАЎ. З 15-га студзеня да 1-га сакавіка па саюзе тэкстыльшчыкаў Беларусі будуць праводзіцца перавыбары фабзаўкомаў.

АДНАЎЛЕНЬНЕ ЗГАРЭЎШАЕ ШКОЛЫ. Белдзяржстрах адпусьціў 13.500 р. на аднаўленьне згарэўшае школы ў м. Капаткевічы.

АЧЫСТКА ДАХАЎ І ВУЛІЦ АД СЬНЕГУ. 1-е аддзяленьне міліцыі прыступіла да абходу домаўладальняў для прыцягненьня да адказнасьці кіраўнікоў дамамі, якія пра выканалі дагэтуль загаду аб ачыстцы даху і вуліц ад лёду і сьнегу.

Здарэньні.

САМАГОНЩЫЦЫ.

сакратар Пухавіцкага

А. Падумны. У пакінутай запісцы Падумны піша, што пакончыў жыцьцё самазабойствам з-за хваробы сэрца.

— ПАКРАЖА Ў ГАСЬЦІНІЦЫ „ЭУРОПА". 9-га студзеня былі абакрадзены тры пакоі ў гасьцініцы „Эўропа", дзе разьмешчаны прыехаўшыя на сэсію члены ЦВК. Па гэтай справе крымінальны вышук затрымаў злодзея—прафесыяналіста І. Швака, які некалькі раз быў пад судом. Украдзеныя рэчы знойдзены.

— ПАКРАЖА Ў ЛАЗЬНІ. Пачынаючы з 1925 г. у лазьні пры станцыі Менск МБВ чыг. сыстаматычна адбываліся пакражы розных рэчаў. Крымінальны вышук па гэтай справе затрымаў злодзея—рэцыдывістага Ф. Банькоўскага.

— РАСТРАТА. Загадчык крамы № 7 ЦРК у Барысаве Бурэйка растраціў каля 200 руб. казённых грошай. Растратчык затрыман.

— ЗАТРЫМАНЬНЕ САМАГОНШЧЫЦЫ. Першае аддзяленьне міліцыі затрымала вядомую самагоншчыцу Чэрлёву. Пры вобыску на яе кватэры, па Савецкай вул. 56, знойдзена 18 бутэлок гарэлкі.

— ВЫКРЫЦЬЦЁ ПАКРАЖЫ. 3-м аддзяленьнем міліцыі выкрыта пакража, якая была зроблена на Маскоўскай вул., 32, у гр-на Мілешка. Затрыман злодзей гастралёр Трусаў. Рэчы знойдзены.

Пр[illegible]нты.

— ЦП рэкамендавала акруговым аддзяленьням скарыстаць вопыт Аршанскага акруговага аддзяленьня, якое наладзіла конкурс калектываў па ўцягваньні членаў саюзу ў касы ашчаднасьці. ЦП прапанавала культаддзелу ўключыць у плян працы культкамісіі папулярызацыю кас ашчаднасьці і нарэшце высьвятліць гэта пытаньне ў насьцягазэтах.

— ЦП прапанавала працкалектыву сясьцёр пры чарговай зьмяняемасьцізьмяняць усе 100 проц. сясьцёр; зьвярнуць увагу на правільнае разьмеркаваньне дзяжурстваў, на ўзьвяльце працоўнай дысцыпліны.

У працаўнікоў сувязі.

— Пленум Цэнтральнага праўленьня склікаецца 1-га лютага. На абвестцы дня: даклады аб масавай працы, аб вытворчым пляне кіраўніцтва сувязі і г. д.

— Паштовыя працаўнікі ўзялі самы актыўны ўдзел у двухтыднёвіку ашчаднасьці. З 13.000 новых укладчыкаў каля 10.000 завербавалі паштовыя касы. Праўленьне прапанавала месцам узмацніць вярбоўку новых укладчыкаў.

— Цэнтральнае праўленьне прызнала слабай працу па ваенізацыі членаў саюзу. Прапанавана ніізавым профарганізацыям узмацніць ваенную падрыхтоўку працаўнікоў сувязі.

Адказ рабселькорам і чытачом.

Ш. Патро. Ці могуць даць скідку па сельгаспадатку гаспадарцы, член сям'і якой служыць у Чырвонай армії?

Адказ: Падайце заяву ў раённую падатковую камісію з далучэньнем спраўкі аб моцнасьці гаспадаркі і знаходжаньні вашага сына ў Чырвонай армії.

Пытаньне: Куды зьвярнуцца за атрыманьнем білета на палячэньне на ільготных умовах?

Адказ: Падайце заяву рабінаму ўпоўнаважнаму бел. саюзу палячэньняў.

Паведамленьні.

— У суботу, 14 студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у цэнтральным габінэце Агітпрацработы адбудзецца канфэрэнцыя членаў гурткоў індывідуалаў самаадукацыі, якія займаюцца на палітэканоміі.

Яўка ўсіх абавязкова.

Бюро самаадукацыі АК.

— МАКК просіць прыбыць на пасяджэньне партгрупкі, якое адбудзецца 13 сьнежня 1928 г., а 6-й гадз. увечары (Энгельса 28): 1. Аляксандрава А. Ф. (працуе ў аддзяленьні „Торгтрэсту" „Тэжэ"). 2. Лепкоўскага (ячэйка шпалерная фабрыкі), 3. Кавлова (яч. заводу „Энэргія"), 4. Ваўчка (яч. заводу „Энэргія"), 5. Бляхера (яч. сельгаспадарч. майстэрняў), 6. Нікульціна (яч. КП(б)Б Белпагрузу), 7. Бароўскага (яч. КП(б)Б нарсувязі), 8. Скрыдлеўскага (раней знаходзячагася ў арганізацыі КП(б)Б Барысаўскай акругі).

Старшыня МАКК Мундау.

Сёньня, 12 студзеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні акругкому МОПРу (вул. Энгельса, 25) склікаецца пашыранае пасяджэньне акругкому МОПРу. Просьба зьявіцца на пасяджэньне членаў АК, РК і рэвізійнай камісіі. Запрашаюцца таксама жадаючыя актывістыя МОПРу.

Клюб гарбароў. У чацьвер, 12 студзеня, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні клюбу адбудзецца вялікі даклад—дыспут т. Канцэльсона на тэму: „Разьвіцьцё кіно ў Беларусі".

Запрашаюцца ўсе культкамісіі саюзу гарбароў.

Пасьля даклада—кіно.

Дакказны рэдактар Ян АСЬМОУ.

АЖЫЦЬЦЯУЛЕНЬНЕ МАНІФЭСТУ ЦВК.

Інструкцыя

Зацьверджана СНК БССР 9-га студзеня 1928 г.

па правядзеньні ў жыцьцё пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР ад 10-га лістапада 1927 г. аб злажэньні з бяднейшага сялянства запазычанасьці па пазыках, выдадзеных для ліквідацыі вынікаў стыхійных нядоляў, а таксама аб сьпісаньні насеннай пазыкі.

1. Сьпісваюцца пазыкі поўнасьцю, або частка іх, выдадзеныя да 7-га лістапада 1927 г. Вобчаствамі Сельска-Гаспадарчага Крэдыту (Акрсельбанкамі) і Сельска - Гаспадарчымі Крэдытнымі Таварыствамі (Селькрэдытамі) бяднейшаму сялянству, як паасобнікам, так і калектывам дзеля ліквідацыі вынікаў стыхійных нядоляў.

Увага: Да стыхійных нядоляў адносяцца: а) пажар, б) градабіцьце, в) разводзьдзе і г) гураган.

2. Для прызначэньня бяднейшай часткі пазычнікаў, атрымаўшых пазыку па аднаўленьне згінутай ад стыхійных нядоляў маемасьці, утвараюцца спэцыяльныя камісіі ў наступным складзе:

а) Пры Вобчаствах Сельска-Гаспадарчага Крэдыту—Старшыня Праўленьня Вобчаства, Загадчык Акруговага Фінансавага Аддзелу, Загадчык Акруговага Зямельнага Аддзелу і Старшыня Акруговага Камітэту Сялянскай Грамадзкай Узаемаданамогі.

б) Пуы Сельска-Гаспадарчых Крэдытных Таварыствах Старшыня Праўленьня Таварыства, Загадчык Раённай Фінансавай часьці, Загадчык Раённай Зямельнай часьці і Старшыня Раённага Камітэту Сялянскай Грамадзкай Узаемаданамогі.

3. Паказаныя ў § 2-м камісіі карыстаюцца ўсімі маючымися ў справах Акрсельбанкаў ці Селькрэдытаў матар'ялямі дзеля дабываньня дадзеных аб сацыяльным складзе пазычнікаў, атрымаўшых пазыкі на ліквідацыю вынікаў стыхійных нядоляў. У выпадках, вызываючых сумненьні дадзеныя гэтыя правяраюцца спосабам па ўгледжаньні камісіі. Усім гэткім пазычнікам складаецца паіменны сьпіс па ўстаноўленай банкам форме, які падпісваецца камісіяй у поўным складзе.

Увага: Прыналежнасьць пазычнікаў да ліку бяднейшых устанаўлецца індывідуальным падыходам у кожным асобным выпадку, лічачы арментовачна бедняком аслабанёнага па беднасьці ад аплаты сельска - гаспадарчага падатку ў 1927-28 г.

4. Дзеля ўстанаўленьня дадзеных аб стратах і іх разьмерах панесеных бяднейшымі пазычнікамі ад пажару і градабіцьця, Акрсельбанкі і Селькрэдыты забіраюць даведкі ў мясцовых Страхавых Агэнцтвах, аб чым у сьпісах вытвараюцца належныя адзнакі, пасьведчаемыя страхавымі агэнтамі.

5. Адносна разьмеру нядоляў ад разводзьдзя і гураганаў Акрсельбанкі альбо Селькрэдыты забіраюць зьвесткі ад Раённых Выканаўчых Камітэтаў, Сельскіх Саветаў, Камітэтаў Сялянскай Узаемаданамогі, альбо правяраюць праз членаў сваіх кіруючых і кантрольных органаў, альбо іншымі па іх угледжаньні спосабамі, такім-жа шляхам правяраюцца выпадкі, калі па якіх-небудзь прычынах загінуўшая ад пажару і градабіцьця маемасьць пазычнікаў ня была застрахована.

6. Пры паступленьні ў Акрсельбанкі, альбо Селькрэдыты заяў ад калектываў, альбо паасобных сялян няўнесеных у сьпісы бяднейшых, аб дапасаваньні да іх ільгот, паказаных у § 1-м інструкцыі, належныя камісіі павінны не пазьней тыднёвага тэрміну з дню паступленьня заяў разглядзець такія заявы і вынесьці па ім свае заключэньне.

7. Сьпісаньню падлягаюць пазыкі, якія выдадзены бяднейшаму сялянству для ліквідацыі вынікаў стыхійных нядоляў:

а) на працягу аднаго году з дня, калі вынікла нядоля і

б) на працягу году да дня нядолі, калі пазыка была выдадзена на загінутую пасьля таго маемасьць.

Увага: У адносінах запазычнікаў папярэдуных ад пашару, у асобых выпадках па ўгледжаньні камісіі, гадовы тэрмін можа быць падоўжан.

8. Разьмер падлягаючай сьпісаньню пазыкі ня можа перавышаць сумы, панесенай ад стыхійных нядоляў страты і па гэтаму ў тых выпадках, калі сума сапраўднай страты менш выдадзенай пазыкі, сьпісаньню падлягае толькі частка пазыкі ў разьмеры не перавышаючым сумы страты. Разьмер панесеных пазычнікамі страт устанаўліваецца камісіяй. Пры прызначэньні страт строга ўлічваць маемасную забясьпеку кожнага паасобнага пазычніка.

9. Паімённыя сьпісы пазычнікаў, з якіх па прызначэньню камісіі падлягаюць сьпісаньню пазыкі поўнасьцю, або часткова, разглядваюцца Праўленьнямі Акрсельбанкаў, альбо Селькрэдытаў сумесна з тымі-жа камісіямі, прычым пастановы Селькрэдытаў разам са сьпісамі (у копіях) прадстаўляюцца ў трохдзённы тэрмін на разгледжаньне Акрсельбанкаў.

10. Акрсельбанкі пастановы свае аб сьпісаньні пазык, выдадзеных, як імі непасрэдна, так і Селькрэдытамі, у 7-мідзённы тэрмін прадстаўляюць на канчатковае зацьверджэньне Акрвыканкомаў, пасьля чаго толькі вытвараецца сьпісаньне пазык у разьмеры прызначаным Акрвыканкомам.

11. Сьпісаньне пазык з бяднейшых пазычнікаў вытвараецца бяз усякага з боку апошніх ходайніцтва.

12. Ільготы, паказаныя ў § 1-м інструкцыі, не распаўсюджваюцца на пазычнікаў, скарыстаўшых атрыманыя пазыкі не на абдудову гаспадаркі.

13. Лічачася за маламоцнымі гаспадаркамі насенная пазыка, выдадзеная з 1922 году да вясны 1927 г. падлягае сьпісаньню поўнасьцю, або часткова толькі ў тых выпадках, калі яна выдадзена за рахунак дзяржаўных фондаў і зварот не абгаворан патурай.

Увага 1-ая: Сьпісаньню падлягае і тая насенная пазыка, якая выдадзена маламоцным гаспадаркам за рахунак Дзяржфонду і пасьля таго была перададзена Камітэтам Сялянскай Узаемаданамогі для спагнаньня.

Увага 2-ая: Сьпісаньне насеннае пазыкі вытвараецца такім-жа чынам, як і грашовых пазык.

14. На пастановы Селькрэдытаў і Акрсельбанкаў пазычнікі могуць прыносіць скаргу, якая падаецца ў 7-мідзённы, з дню апавяшчэньня ім пастановы, тэрмін. Скаргі падаюцца на пастановы Селькрэдытаў Акрсельбанкам, а на пастановы апошніх-Белсельбанку.

15. Прадугледжанае гэтай інструкцыяй сьпісаньне пазык павінна быць канчаткова праведзена ад мясцох да 1-га ліпеня 1928 г., пасьля гэтага ўсякія хадайніцтвы аб сьпісаньні пазык не разглядаюць разгледжаньню.

АРГАНІЗАВАУСЯ АУТАДОР БССР.

6.800.000 РУБ. СТРАТЫ ДАЕ СЯЛЯНСТВУ СУЧАСНЫ СТАН БЕЛАРУСКІХ ДАРОГ.

СТВАРАЮЦЦА АУТАМАБІЛЬНАЯ І ДАРОЖНАЯ СЭКЦЫІ.

10-га студзеня а 7 гадзіне вечара ў залі пасяджэньняў СНК адбыўся арганізацыйны сход Аўтадору.

Сход адкрыў нам. старшыні СНК т. Карклін. У сваім уступным слове ён сказаў наступнае аб задачах і мэтах Аўтадору:

— За апошні час пытаньні транспарту пачынаюць адыгрываць усе больш і больш значэньне. Транспарт робіць пераход ад аднаўленчага перыяду да рэканструкцыйнага з спазьненьнем. 15 ты зьезд партыі ўдзяліў вялікую ўвагу пытаньням транспарту і адзначыў неабходнасьць прыцягненьня савецкай грамадзкасьці да вытаньняў далейшага разьвіцьця і будаўніцтва транспарту.

Зусім відавочна, што ў гэтай справе грамадзкая ініцыятыва павінна адыграць значную ролю. Праблема індустрыялізацыі краіны можа расьпяхова вырашыцца толькі ў тым выпадку, калі да гэтай справы будуць прыцягнуты шырокія колы працоўных.

Артыкулы тав. Асінскага (Амэрыканскі аўтамабіль, ці расійская фурманка), надрукаваныя ў „Правде", адыгралі вялікую ролю ў справе прыцягненьня савецкай грамадзкасьці да справы аўтабудаўніцтва і грамадзкага садзейнічаньня наленшаньню дарог. Гэтыя артыкулы в з зацікаўленасьцю абгаворваліся на прадпрыемствах, установах і вёсцы. Цяпер кожнаму з нас відавочна, што прыйсьці да намечанай партыяй мэты—індустрыялізацыі краіны, мы можам па праежджым шляху і пры наяўнасьці махавічных спосабаў перасоўкі—матораў.

У справе паленшаньня стану нашых дарог і ўкараненьня ў мясцовы транспарт аўтамабілю грамадзкая ініцыятыва і энэргія павінны адыграць рашаючае значэньне. Гэта задача выпадае на долю арганізуемага намі ў сучасны момант Аўтадору БССР.

Ініцыятыўная група таварышоў лічыць, што на першы час практычная работа таварыства „Аўтадор" павінна разгарнуцца ў двух напрамках адзаведна двывом сэкцыям, якія будуць утвараць абранае на тым сходзе праўленьне дарожная і аўтамабільная. У задачы першай сэкцыі будзе ўваходзіць садзейнічаць дарожнаму будаўніцтву.

У палепшаньні стану нашых дарог у першую чаргу зацікаўлена сялянства. Па няпоўных падліках нашых спэцыялістых шляхавай справы сучасны стан нашых дарог прыносіць усяму сялянскаму калектыву БССР страт на суму 6.800.000 руб. штогодна. Пераўтварэньне хоць-бы часткі гэтых сродкаў на патрэбы шляхавага будаўніцтва аказала-б значную дапамогу дзяржаве і садзейнічала-б палепшэньню эканамічнага і культурнага росту вёскі.

Разьвіцьцё аўтамабільнай справы прадстаўляе вялікі інтарэс як для гораду, так і для вёскі. Пытаньні папулярызацыі ідэі матору, укараненьня аўтамабілю ў мясцовы транспарт, падрыхтоўкі і пераквалёфікацыі работнікаў аўтатранспарту, стандартызацыі нашай аўтамабільнай гаспадаркі—вось тыя задачы і мэты, якія на першы-ж час стануць перад аўтасэкцыяй.

Мы з вамі, таварышы, пачынаем вялікую справу. Мы выклікаем на дапамогу партыі, савецкай уладзе грамадзкую самадзейнасьць, прыцягваем яе да справы індустрыялізацыі краіны. Той гарачы волгук, які спаткаў ідэю ўтварэньня таварыства „Аўтадор" у БССР, служыць га, антыай таго, што пачатую намі справу мы зможам пры ягчэ большым актыўным падтрыманьні мас выканаць пасьпяхова.

Пасьля тав. Карклін т. Арлоў агаласіў статут.

На гэтым-жа пасяджэньні быў выбран часовы савет і часовае праўленьне таварыства Аўтадору БССР.

НАШ ЭКРАН.

Кароль на „варце".

Начальнік міліцыі 1-га аддзяленьня Менскае гарадзкое міліцыі ня раз правяраў, ці добра ведаюць міліцыянэры даверанага яму аддзяленьня статут міліцэйскай службы. Малайцаватыя хлапцы бойка адказвалі на ўсе запытаньні свайго начальніка. Вартавую службу таксама выконвалі добра і статут ведалі на вузок.

Але мудрэйшы за ўсіх міліцыянэраў тут-гэта тав. Кароль. Што яму статуты, што тэорыя? Ён чалавек практыкі, дый пра савецкія законы таксама мала дбае. Кароль звычайна кажа, што для сумленнага чалавека ўсё роўна, ёсьць закон ці няма, бо яго ўчынкі як раз сведчаць аб адваротным.

Аднойчы Каралю залумалася перамяніць сваю кватэру. Абходзячы свой вучастак, ён заўважыў у адным з жактаўскіх дамоў кватэру на замку. Кароль вусім і ведаць ня хоча пра тое, што ёсьць праўленьне жакту, якое загадвае кватэрамі. Што Каралю парадак, законы? Для яго законы вусім ня пісаны.

Неяк вечарам, пасьля службы Кароль пераселяецца ў новую кватэру. Нічога, што жакт кватэру узяў на замок. У Караля ў такіх разох таксама сродак ёсьць. Ён бяры лом, раз два падвярнуў і гатова. Кватэра да вашых паслуг.

Крымінальнае злачынства, неяк не да твару міліцыянэра. Ці няпраўда, таварыш начальнік аддзяленьня!

М. Б.

Аграномы і экспарт.

Наркамзем БССР зьвярнуў увагу зямельных акругорых аддзелаў на неабходнасьць узмацненьня экспарту с.-г. прадуктаў і сырцу. Наркамзем адзначае, што ўзмацненьне экспарту с.-гаспадарчых прадуктаў адабʼецца на забесьпячэньні рэалізацыі імпартнага пляну, а таксама на разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Для больш пасьпяховага выкананьня гэтай задачы НКЗ прапануе аддзелам на мясцох зьвярнуць на справу экспарту шырокую грамадзкую ўвагу. Акруговыя аддзелы павінны даць раённым агранонам дырэктывы аб уключэньні імі ў плян сваёй працы на курсах, с.-г. гурткох і ў бягучай працы—папулярызацыі экспартных загатовак, узьнацьця якаснага боку загатовак і выяўленьня экспартных магчымасьцяй.

СУД.

Пра каня дакскога казака Драздова.

Драздоў Зьміцер—данскі казак. У 1918 годзе паступае ён дабравольцам у Чырвоную армію. З усіх бакоў насядалі на нас ворагі. А наша армія толькі арганізоўваецца. Драздоў варочаецца на Дон і бярэ з сабою каня, сядло і зноў паступае ў рады абаронцаў рэвалюцыі. Драздову прыходзілася быць на ўсіх франтох, а галоўным чынам супроць Дзянікіна і Калчака. Конь ня раз выручаў яго ў самыя небясьпечныя моманты вайны.

Ваенная бура патроху сунімаецца. Армія пераходзіць на мірнае палажэньне. Драздоў падае заяву ў часьць, каб за ім назаўсёды замацавалі яго каня. Завязалася перапіска. Усе абяцалі, нават тав. Гай ведаў пра гэта. Але адбываецца перафарміраваньне часьцей, і Драздоў пераводзіцца ў № кавалерыйскі полк. Тут пра гэту справу ніхто ня знаў. І вось на падставе загаду РВС, Драздоў, як незарэгістраваўшы своечасова свайго каня, пазбаўляецца права на яго замацаваньне за сабою.

Зараз Драздоў старшы каманды сувязі. Ён не пакінуў дамагацца свайго і падае ў нарсуд 11-га вучастку аб замацаваньні за ім каня і ўпражы.

— Толькі падумайце, т. т. судзьдзі,—заяўляе Драздоў на судзе. Гэты конь тры разы выручаў мяне з бяды ў самыя небясьпечныя моманты бою. Мы тры разы былі з ім ранены і цяпер шкода з ім расстацца. Пра загад РСВ я нічога ня ведаў.

Нарсуд, бяручы пад увагу ўсе ваенныя заслугі Драздова і яго цяперашнюю службу ў Чырвонай армії, а таксама і немагчымасьць падыходу да гэтае справы з пункту погляду фармальнага прыстасаваньня да ісца загадаў аб рэгістрацыі коняй, як гэта зрабіў № кавалерыйскі полк, прыгаварыў забраць з уладаньня №-га кавалерыйскага палка каня і ўпраж і перадаць Драздову Дз. У адмоўным выпадку сыскаць з адказчыка на карысьць Драздова 350 рублёў.

Полк гэтым рашэньнем не здаволіўся і абскардзіў яго ў Менскі акруговы суд, які прыгавар нарсуду 2-га вучастку пакінуў у моцы.

М. Г.

Выкананьне працдагавору.

Сяргей Кірыкаў, знаходзячыся на службе ў Піменаўскім лясьніцтве, Башкірскай рэспублікі, атрымаў ліст ад прафэсара Фядзюшына аб тым, што ў Беларускім палаўнічым запаведніку ёсьць вакантная пасада палявода.

Доўга не разважаючы, Кірыкаў у той-жа дзень тэлеграфаваў у Менск аб сваёй згодзе заняць гэтую пасаду.

19-га верасьня Кірыкаў атрымаў адказ з Менску, што ён назначаецца памоцнікам лясьнічага з акладам 70 рублёў у месяц. У той-жа дзень Кірыкаў выехаў у Менск, куды прыехаў праз месяц, г. зн. 20-га кастрычніка. У той час як ён ужо быў у дарозе, з Менску была паслана тэлеграма аб зьмене назначэньня яго.

28-га кастрычніка Кірыкаў зьявіўся ў лясное праўленьне Наркамзему, дзе яму адказалі, што яго месца занята. Кірыкаў падаў у працэсэію іск, у якім прасіў прысудзіць яму грошы за праезд і за той месяц, які ён правёў у дарозе.

Працэсэія, лічачы тэлеграму, якою Кірыкаў запрашаўся на работу, яўным доказам наліччa працдагавору, абавязала лясное праўленьне Наркамзему выплаціць Кірыкаву грошы за праезд і за час знаходжаньня ў дарозе, усяго ў суме 184 рублёў.

Напад на Моў-Шан-Сью.

У ясны веснавы дзень па прасёлачнай дарозе праходзіў кітаец Моў-Шан-Сью. Ішоў ён з вёскі Палічча, Маласітнянскага сельсавету, (Полаччына) у суседнюю вёску. Лёс закінуў яго з далёкага Усходу ў глухія куткі Полаччыны яшчэ з часу імпэрыялістычнай вайны.

Моў-Шан-Сью нёс з сабою на 100 рублёў дробнага галянтарэйнага тавару, а таксама розныя дзіцячыя цацкі, якія і прадаваў па вёсках Полаччыны. Гэта была яго галоўная крыніца здабываньня сродкаў на пражыцьцё.

Частку дарогі Моў-Шан-Сью давялося ісьці лесам. Недалёка ад вёскі Чарбаліна ён пачуў, што нешта шапаціць у лесе. Не пасьпеў аглянуцца кітаец, як раптам на яго ззаду напаў рабуншчык Манякоў Пётра і пачаў страляць з абрэза. Моў-Шан-Сью нават і не падумаў уцякаць, альбо супраціўляцца. Ён стаў і толькі крыкнуў па-кітайску „жынду" (чалавек). Але абрэз ня даў ніводнага стрэлу. Тады Манякоў паваліў кітайца на зямлю і пачаў яго біць. Ад пабояў апошні страціў прытомнасьць і паваліўся на зямлю.

У гэты час праходзіў зусім выпадкова тэй-жа дарогай гр. вёскі Зазер'е Жалязьнякоў. Рабуншчык Манякоў, убачыўшы, што ён тут можа папасьці ў пастку, кінуў зьбіваць Моў-Шан-Сью і, схапіўшы яго рэчы на суму 100 рублёў, пачаў уцякаць. Наўздагон яму пабег Жалязьнякоў.

Рабуншчыку прыходзілася крута. Ён кінуў тавар, а сам схаваўся, а потым на другі дзень пасьля нападу, каб замясьці сьляды злачынства, сеў у цягнік і накіраваўся ў Бабруйск. Па дарозе Манякоў быў затрыманы.

Полацкі акруговы суд прыгаварыў Манякова за ўзброены напад на 8 год зьняволеньня.

Тэатр і кіно.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр. Сёньня, 15 студзеня „КАЛЯ ТЭРАСЫ" драма ў 4 дзеях з часоў 1917 году. Пачатак а 8 з палов. гадзіне

Кіно-тэатр „Культура" Перыцы бліскучы баявік „ВОДОВОРОТ" Звыш праграмы: ХРОНІКА СОВКІНО № 108.

Кіно „Чырвоная Зорка". ГРАНДЫЁЗНЫ АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК „ВЕЧНАЯ БОРЬБА", частак. драма ў 6 часьц. Штодзённа 4 сэансы. СКОРО! | VARIETE | СКОРО!

Кіно „Пралетары". „СПАРТАК" Штодзённа 4 сэансы: а 6, 7 з пал. 9 і 10 з пал. гадз. АНОНС! ЧАРГОВАЯ ПРАГРАМА „ВТОРАЯ ЖЕНА"

Кіно „Інтэрнацыянал". ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ. па аповесьці Лермантава «Герой нашего времени» „БЭЛА", у 8 часьц.

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫЎ-ПАПЕРА, макулатура і старыя газэты — Цана зьніжана — Зварочвацца ў галоўную кантору газ. «Зьвязда». Савецкая, 63, 3-ці паверх.

Секаровская жидкость „ВЫТЯЖКА ИЗ СЕМЕННЫХ ЖЕЛЕЗ" приготовленная по способу профессора Д-ра БЮХНЕРА. ЦЕНА ФЛАКОНА 2 р. Имеется в продаже во всех аптеках и магазинах санитарии и гигиены СССР. Почтой из главного склада высылается не менее 4-х флаконов при получении задатка 25%. Пересылка и упаковка за наш счет. Врачам для испытания по требованию высылается GRATIS. Москва, Герцена № 5. Лаборатория кооператива „Гален-Москва" отд. 10. Заказы просим направлять адресовать:

ПРЫМАЕЦЦА разавы памол і абдзір ЯЧМЕНЮ НА КРУПЫ ў зноў пушчаным ДЗЯРЖМЛЫНЕ „Чырвоны Штандар" па Чырвонаштандартнай вуліцы, № 42 (был. Белацаркоўная) ад усіх дзяржустаноў і суседняга сялянства па 8 кап. за пуд. 456. Менсельпрам.

ВЯЛІКІ ДЫСПУТ аб п'есе „КОНСТАНТИН ТЕРЕХИН", арганізуе сёньня ЮНСЭКЦЫЯ ДРУКАРОЎ. З уступнай прамовай выступіць тав. ДАВІДОВІЧ. Пачатак а 6-й гадз. увечары. Уваход па білетах, разасланых па прадпрыемствах.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Вучотна-конская картка № 3299 Гайчука І., выд. Бягомльскім РВК. 382

Вучотна-конская картка Казака І., выд. Халопенінскім РВК. 383

Сяброўская кн. Меламеда Ц., выд. саюзам мэдсанпрацы. 384

Сяброўская кніжка Карбут А. Ц., выд. саюзам саўгандзьлужачых. 385

Пашпарт, асабовая кн. і віза Юрыцка М. М. 381

Кн. на кармл. дзіцяці Руданоўскага К. Г. 387

Вайсковая кн. Лешенко К. К., выд. б. Вітэбскім ВВК. 388

Асабовае пасьведчаньне Ходаша М. А., выд. Менакрміліцыяй. 1266

Вучотная картка Мурашка Г. І., выд. Лагойскім РВК. 1262

Асабовае пасьведчаньне Вовсі М. Б., выд. Менміліцыяй. 126.

Дапрызыўная картка Кедышка М. Б., выд. Менваенкаматам. 126

Вайсковы біл. Барона Я. І., выд Харкаўскім ваенкаматам. 126

Конская картка Сьляпянскага А.І., выд. Заслаўскім РВК. 126

Капэрац. кн. Лойка В. В., выд. МЦРК. 126

Асабовая картка Біргера Е. М., выд. Мен ваенкаматам. 126

Пасьведчаньне Біргера Е. М., выд. Дзяржгандлёлам. 126

Сяброўская кн. Курысіча С. Ф., выд. саюзам будаўнікоў. 126

Асабовае пасьведчаньне Індыка І. Ш., выд. Менміліцыяй. 127

Матрычная выпіс Міркіна А.